ARCHE ARCHE 1’07

1. Зьмест / Уводзіны
2. ARCHE :: Галоўная
3. Віталь Сіліцкі. Што супольнага паміж Ніязавым і Кастра
4. Ганс-Георг Вік. Як выйсьці зь беларускага тупіка?
5. Віталь Сіліцкі. Частка формулы, якая мела вынікам Лукашэнку

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (53) - 2007**

[image]

[image]

[image]

1[image]-[image]**2007**

аналітыка • крытыка • эсэістыка • палеміка • гісторыя • літаратура

[image] [image] [image]
[image]

Зьмест

Contents

АНАЛІТЫКА

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ Што супольнага паміж Ніязавым і Кастра, альбо Чаму дыктатуры перажываюць дыктатараў
ГАНС-ГЕОРГ ВІК Як выйсьці зь беларускага тупіка?

КРЫТЫКА

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ Частка формулы, якая мела вынікам Лукашэнку
ЗЬМІЦЕР САЎКА Вярблюд на трасянцы. Улады ўзяліся рэгуляваць тое, чым яны й ня думаюць карыстацца
З. Ф. САЎКА Правілы левапісу, або Што нас чакае, калі новая рэдакцыя
«Правілаў беларускага правапісу і пунктуацыі» стане афіцыйным дакумэнтам
ПЁТРА РУДКОЎСКІ Пра рэлігійны дагматызм таварыша Рубінава

ЭСЭІСТЫКА

ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ Яны проста гуляюць (Наконт моладзевага супраціву)

ПАЛЕМІКА

ПЁТРА РУДКОЎСКІ «Хлопчык-ідыёт» сярод «сьмецьця» Гайдэгера,
або Як Бабкоў пасунуўся да межаў абсурду
АЛЕСЬ АНЦІПЕНКА Незалежная беларуская прэса на мяжы зьнікненьня: што значыць такая сытуацыя?
ТОМАС ВЭНЦЛАВА — АНДРЭЙ КАТЛЯРЧУК Ці можна пісаць пра Літву і забывацца пра Беларусь? Тры праекты «Міцкевіч», распачатыя ў мадэрны той час
Вакол аднаго Берасьця. Рэпліка ІРЫНЫ ЛАЎРОЎСКАЙ і адказ АНДРЭЯ КАТЛЯРЧУКА
АЛЯКСЕЙ ПІКУЛІК Чатыры крызісы беларускай апазыцыі

ГІСТОРЫЯ

ВОЙЦЕХ СЬЛЯШЫНСКІ Барацьба дзяржаўных органаў зь беларускай дывэрсійнай дзейнасьцю на паўночна-ўсходніх землях міжваеннай Польшчы (1920–1925)
ЛІЯ ГРЫНФЭЛД Нацыяналізм і сьвядомасьць
МІРАСЛАЎ ГРОХ Ад этнічнай групы да мадэрнай нацыі: чэшскі прыклад
ЭНТАНІ СЬМІТ Гісторыя і лёс нацый: адказы і ўдакладненьні

ЛІТАРАТУРА

ЮРЫ АНДРУХОВІЧ Лірыка
ФІЛІП ТОПАЛ Карла Залатара падарожжа на Корсыку
СЭМ ТОПЭРАФ Тарантул

РЭЦЭНЗІІ

ПАВАЛ АБРАМОВІЧ Краіна мёртвых паэтаў
УЛАДЗІМЕР САКАЛОЎСКІ Беларуская Біблія ў нямецкім выкананьні

[image]
[image]

№ 1 (53) - 2007

Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне на старонцы: 2007/02/09
[image]

[redacted]anwhoknows

Powered by phpBB © 2001, 2005 phpBB Group

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ
палітоляг, сталы аўтар «ARCHE».

Віталь Сіліцкі Што супольнага паміж Ніязавым і Кастра, альбо Чаму дыктатуры перажываюць дыктатараў

2006 год быў надзвычай няўдалы для дыктатараў. Слабадан Мілошавіч, Фідэль Кастра (які фактычна, нягледзячы на заявы дактароў, ужо адной нагой на тым свеце), Аўгуста Піначэт, Сапармурат Ніязаў і, наапошку, Садам Хусэйн... Яны адышлі ў розных абставінах: хто ў палацавым ложку, хто ў астрогу, хто на шыбеніцы. Зыход адных стаўся сапраўдным шокам, для іншых палітычная смерць наступіла ўжо даўно. Але развітанне з сатрапамі рознага гатунку – чырвонага, зялёнага і нават шэра-бура-малінавага, стала яшчэ адной нагодай узгадаць, што дыктатары не вечныя і ніякія намаганні, ніякія рэпрэсіі, ніякія спробы абвясціць сябе богам, прарокам ці яшчэ кімсьці не здолеюць падмануць няўмольную логіку часу і гісторыі.

Нельга сказаць, аднак, што мінулы год быў гэтаксама няўдалы для дыктатураў. Знікненне з палітычнай арэны такіх мастадонтаў, як Ніязаў і Фідэль, не спрычынілася ані да пераменаў, ані да крызісаў. Астатнія з адышоўшых – былыя і

ўжо даўно скінутыя, іхні лёс – гэта адгалосак даўно мінулых падзеяў, хваляў палітычных трансфармацыяў, што ўжо адкацілі. Іхнія калегі ва ўсім свеце не тое каб «не заўважылі страты байцоў», але відавочна не пахіснуліся, а многія, наадварот, умацаваліся і нават бравіравалі сваёй трываласцю і недатыкальнасцю. Некаторыя яшчэ раз прадэманстравалі здольнасць заручыцца падтрымкай народа шляхам выбараў і рэферэндумаў. Іншыя актыўна займаліся калектыўнай узаемадапамогай, вандруючы па свеце з валізкамі нафтадаляраў і прапануючы інвестыцыі і кантракты роднасным душам і братам па зброі ў барацьбе з экспансіяй новага сусветнага парадку. Яны таксама актывізаваліся ў рамках міждзяржаўных хаўрусаў, якія ставяць болей канкрэтныя мэты, у тым ліку – мінімізацыю замежнага ўплыву і ўціску з мэтай будавання дэмакратыі: дастаткова нагадаць абрад цырыманіяльнага братання ў Гаване на саміце руху недалучэння. Самыя адчайныя, спадзеючыся, што ад іх адчэпяцца з дэмакратыяй і правамі чалавека па век вякоў, імкнуліся займець ядравую зброю альбо нават паспелі-такі яе займець. Паводзіны Кім Чэн Іра ў Паўночнай Карэі і Махмуда Ахмадынеджада ў Іране сведчаць пра тое, як далёка можа завесці інстынкт самазахавання тых, хто гатовы паставіць на карту літаральна ўсё дзеля палітычнага выжывання. Акрамя таго, 2006 год прадэманстраваў, што праграма «пашырэння дэмакратыі ў свеце», пра якую так голасна заявіў быў летась прэзідэнт ЗША Джордж Буш падчас сваёй інаўгурацыі, аказалася не больш чым наборам дэкларацый. Спатыкнуўшыся ў Іраку і перажыўшы цэлую серыю ўнутрыпалітычных скандалаў, адміністрацыя Буша паклікала на дапамогу зброў адміністрацыі Ніксана і Буша-старэйшага, якія не хаваюць непрыязнасці да замежнапалітычнага ідэалізму.

На 2006 год у свеце захавалася 47 краінаў, якія, паводле «Freedom House», дагэтуль застаюцца «несвабоднымі». Такіх краінаў за апошнія пяць гадоў паменела толькі на адну. У той самы час колькасць «цалкам свабодных» краінаў за тыя самыя пяць гадоў выросла зноў жа такі на мізэр – з 86 да 88. Трэба заўважыць, што за папярэднія пяць гадоў (1995–2000) колькасць вольных краінаў пабольшала з 75 да 86, а кансалідаваных дыктатураў паменшала з 53 да 47. Такім

чынам, на пачатку XXI ст. відавочна назіраецца глабальнае запаволенне дэмакратычных тэндэнцыяў, што паслядоўна распаўсюджваліся па ўсім свеце пачынаючы з 1970-х гг.

Прычыны трываласці ў кожнай з існых дыктатураў розныя – як казаў класік, шчаслівыя сем'і шчаслівыя аднолькава, а нешчаслівыя няшчасныя кожная па-свойму. Сучасныя дыктатуры (а не кволыя канкурэнтныя аўтакратыі) фармуюцца ў адмысловым працэсе натуральнай селекцыі, у якой выжывае найспрытнейшы, найбольш кемлівы і найменш абмежаваны комплексамі ці правіламі прыстойнасці. У параўнанні з мінулым яны не абавязкова робяцца больш жорсткія, але відавочна больш прымітыўныя. Папярэднія хвалі дэмакратызацыі збольшага «павымывалі» рэжымы, якія грунтаваліся на манаполіі на ўладу палітычнай партыі (і як наступства – рабіліся хісткімі ў выніку ідэалагічнага крызісу) альбо на ўладзе ваенных хунтаў (сярэдняя працягласць жыцця якіх была найкарацейшай у параўнанні з іншымі тыпамі дыктатураў). Большасць сучасных дыктатураў – гэта персаналізаваныя рэжымы, заснаваныя на неабмежаванай уладзе першай асобы і поўным падпарадкаванні ягонай волі ўсіх механізмаў дзяржавы. Такія рэжымы не толькі пакідаюць «выпаленую зямлю» на месцы, дзе мусіла развівацца грамадзянская супольнасць, палітычныя партыі ці незалежная прэса, але таксама канструююць сябе ўнутры такім чынам, каб як мага змінімізаваць магчымасць нейкіх унутраных узрушэнняў, звязаных з гульнёй элітаў, міжфракцыйнай канкурэнцыяй, франдзёрствам і г. д. Яны імкнуцца імунізаваць сябе як ад вонкавага ўціску, так і ад унутранага. Гэта дасягаецца шляхам максімальнага разбурэння інстытутаў, якія вызначалі б правілы гульні і неяк стрымлівалі б рэпрэсіўныя дзеянні, а таксама гадаваннем і пеставаннем атачэння stakeholders – памочнікаў і калабарантаў, у першую чаргу з асяродку сілаў бяспекі і спецыяльных паліцэйскіх фармаванняў, для якіх не існавала б будучыні па-за рамкамі існых рэжымаў. Тэндэнцыя да персаналізацыі ўлады заўважная нават у рэжымах, якія першапачаткова будаваліся на прынцыпах партыйнай ці ваеннай дыктатуры.

Яшчэ адно-два дзесяцігоддзі таму былі модныя канцэпцыі

«развівальнага» (developmental) аўтарытарызму, размовы пра тое, што пэўная форма дыктатуры неабходная для паспяховага эканамічнага і сацыяльнага развіцця, што дэмакратыя прыносіць больш бядотаў, чым карысці, пэўным культурам і грамадствам. Гэтыя размовы не спыніліся дагэтуль, але яны падтрымліваюцца амаль выключна прыкладамі няўдачаў і крызісаў у маладых дэмакратыях, а не поспехамі і прагрэсам у дыктатурах. Новыя Лі Куан Ю, Дэн Сяа Піны і Піначэты не з'яўляліся ўжо некалькі дзесяцігоддзяў. Замест гэтага відавочная тэндэнцыя да прымітывізацыі сучасных аўтакратый і сатрапій, да пераходу да больш рэпрэсіўных метадаў самазахавання, якія распаўсюджваюцца і на грамадства, і на эканоміку. Нельга сказаць, што ўсе сучасныя аўтарытарныя рэжымы – гэта арэалы жабрацтва і катастрофаў, але за некалькімі выняткамі адносны дабрабыт і развіццё ў іх, непасрэдна ці ўскосна, забяспечваецца ў першую чаргу высокімі цэнамі на сыравіну, што толькі падкрэслівае тэндэнцыю да прымітывізацыі гэтых рэжымаў, таксама як і іхніх прыхільнікаў і паслядоўнікаў (для якіх сяброўства з аўтакратам, што сядзіць на нафтавай ці газавай свідравіне, робіцца зарукай уласнай бяспекі).

Сярод палітолагаў, аднак, доўгі час дамінавала ўпэўненасць, што менавіта канструкцыя персаналізаванага дыктатарскага рэжыму (неабмежаваная ўлада першай асобы, выкараненне асяродкаў уплыву і аўтаноміі, пазбаўленне падставаў для ўзнікнення магутных кланаў, вынішчэнне інстытуцыянальных каналаў, якія рэгулявалі б правілы гульні па-за воляй і простым наглядам уладара) урэшце праграмуе ўзрушэнні, асабліва калі аслабне здольнасць першай асобы асабіста трымаць стырно ўлады ў сваіх руках. Кропка навышэйшай рызыкі для такіх дыктатураў наступае ў момант смерці альбо раптоўнай хваробы дыктатара. Адсутнасць правілаў гульні мусіць прывесці да барацьбы без правілаў у пераходны перыяд. Як вынік, пры такім сцэнары чакаецца палітычная нестабільнасць, адкрытая барацьба за ўладу, хаос і гвалтоўнае развіццё падзеяў. Хуткага надыходу дэмакратыі пры гэтым, вядома, не чакаецца, але са смерцю дыктатараў, паводле тэорыяў, паўстае магчымасць для паслаблення персаналізаванага аспекту дыктатураў, іх трансфармацыі ў больш мяккія варыянты, што ў

перспектыве стварыла б перадумовы для пэўнай лібералізацыі. Аднак за 2006 год стала відавочна: дыктатуры навучыліся не толькі адсякаць магчымасці каляровых і іншых рэвалюцыяў, а гэтаксама прадбачыць і прэвентыўна ліквідаваць завады ва ўласных канструкцыях, якія маглі б прывесці да збою сістэмаў у самы непрыдатны момант.

Што, здавалася б, магло быць супольнага паміж рэжымамі Фідэля Кастра і Сапармурата Ніязава? На першы погляд – мала чаго, акрамя аднолькавага (найніжэйшага) рэйтынгу таго самага «Freedom House». Пералік гістарычных, геапалітычных, культурных і шмат якіх яшчэ адметнасцяў дзвюх краінаў, рэжымаў ды лідэраў быў бы занадта даўгі і наўрад ці патрэбны. Абставіны і дынаміка працэсу пераходу ўлады ў 2006 г. ад аднаго лідэра да іншага адрозніваліся гэтаксама ж. Такія адрозненні робяць яшчэ больш цікавым і паказальным падабенства канчатковага выніку пераходу: незалежна ад абставінаў, змена варты адбылася хутка і эфектыўна, а новыя старыя ўладары не пакінулі ні найменшага сумневу ў сваіх здольнасцях утрымаць сітуацыю пад кантролем.

Тое, што менавіта так усё адбылося на Кубе, здзіўляць не павінна (акрамя, можа, эмігранцкіх колаў у Маямі і некаторых чыноўнікаў у Дзярждэпе ЗША, якія лічылі, што пасля зыходу Кастра з палітычнай арэны камунізм на Кубе доўга не пратрывае, і ўжо намалявалі планы і стратэгіі рэканструкцыі і трансфармацыі Кубы). Фідэль пабіў амаль усе магчымыя рэкорды знаходжання ва ўладзе, нягледзячы на шматлікія спробы яго зрынуць, шэраг эканамічных блакадаў, крызісаў і сапраўдных калапсаў. Кастра разумеў не горш за назіральнікаў і ўласных нядобразычліўцаў верагоднасць таго, што пасля ягонай смерці камунізм на Кубе можа доўга не пратрымацца. Такім чынам, да перадачы ўлады Кастра рыхтаваўся доўга і грунтоўна. Па-першае, ён перадухіліў магчымасць узнікнення кубінскіх Гарбачовых праз кволыя спробы эканамічнай лібералізацыі, на якія кубінскі рэжым мусіў пайсці ў сярэдзіне 1990-х гадоў, і вычысціўшы ўладныя структуры ад пераважнай большасці тых, каго падазравалі ў рэфарматарскіх памкненнях. Па-другое, Кастра доўга рыхтаваў свайго пераемніка. Тое, што пасля яго да ўлады прыйдзе брат Рауль, сумненняў даўно не

выклікала. Пры гэтым Фідэль дазволіў Раулю, які быў міністрам абароны і фактычна кантраляваў сілавыя структуры, сканцэнтраваць як палітычную ды сілавую, так і фінансавую ўладу: пад ягоны кантроль былі перададзеныя найбольш даходныя сферы кубінскай эканомікі, перш за ўсё турызм. Патрэцяе, прасоўваючы брата, Фідэль парупіўся аб тым, каб у яго не было моцных канкурэнтаў у сілавых структурах, якія цягам апошніх гадоў прайшлі праз жорсткую чыстку. Нарэшце, беспрэцэдэнтнае рашэнне Фідэля Кастра перадаць уладу малодшаму брату (нібыта на перыяд хваробы) забяспечыла кантраляваны пераход, апярэдзіўшы магчымыя закулісныя інтрыгі. Зразумела, што 76-гадовы Рауль – фігура пераходная і яму таксама вельмі хутка прыйдзецца даваць рады пытанням, з якімі сутыкнуўся летась Фідэль. Аднак апераджальны манеўр старэйшага брата даў яму магчымасць скансалідаваць уладу пад новым кіраўніцтвам. Пад размовы пра рэформы і лібералізацыю (у пэўных колах Рауля ўважаюць за латэнтнага рэфарматара) ён хуценька адсунуў ад улады партыйных бюракратаў і замяніў іх на праверaных таварышаў з шэрагаў кіраўнікоў спецслужбаў і войска.

Туркменістан, вядома, – не Куба, і нават пры самым неверагодным форс-мажорным сцэнары развіцця падзеяў (які воляй найвышэйшых сілаў рэалізаваўся ў канцы 2006 г.) дэмакратызацыі там ніхто не чакаў, улучна з апазіцыяй (якая, вядома ж, існавала толькі на эміграцыі) і замежных назіральнікаў. Аднак раптоўная смерць Ніязава, здавалася б, стварыла ўсе перадумовы для *doomsday scenario*. Нягледзячы на ўсе праблемы са здароўем, пра якія мы ўрэшце даведаліся, Туркменбашы, магчыма, лічыў сябе «трошкі вышэйшым» за бога і таму займаўся ўласнымі залатымі статуямі і лядовымі палацамі ў пустэльнях, а не пераемнікамі. Поўнае разбурэнне ўсіх магчымых, нават тэарэтычных інстытуцыянальных каналаў перадачы ўлады, слабасць рэгіянальных кланаў, перманентная ратацыя ўладных элітаў (напрыклад, у пяці вобласцях краіны за 10 гадоў змяніліся 52 губернатары), нарэшце, надзвычай высокія стаўкі ў гульні за кантроль над багатай прыроднымі рэсурсамі краінай – усё гэта спарадзіла размовы пра непазбежны перыяд нестабільнасці, анархіі і гвалту ў працэсе барацьбы за спадчыну Туркменбашы.

Усе размовы, аднак, скончыліся амаль у той самы дзень, калі стала вядома пра смерць Ніязава. Тое, што на Кубе планавалася гадамі, у Туркменістане адбылося спантанна і за некалькі гадзінаў. Пры гэтым высветлілася, што адсутнасць правілаў гульні максімальна спрашчае варункі барацьбы за спадчыну нябожчыка тырана. У гэтай барацьбе шанцаў на перамогу больш у таго, хто бліжэй за ўсіх стаяў ля цела правадыра, ягоных грошай і рэпрэсіўнага апарату. Як заўжды ў такіх сістэмах, гэтыя тры рэчы ў Туркменістане шчыльна ўзаемазвязаныя. Прызначэнне пераемнікам міністра аховы здароўя давяло тэрмін «бліжэй да цела» да вяршыняў абсурду. Тандэм галоўнага доктара краіны Гурбангулы Бердымухамедава і галоўнага сілавіка (загадчыка ўласнай аховы) Акмурада Рэджэпава выглядае камічна, але цалкам лагічна з гледзішча таго, якім чынам у свой час панаваў Туркменбашы. Пасля таго як «накрылі» Ніязаўскага скарбніка, які трымаў кантроль за ягонымі банкаўскімі рахункамі, барацьба за ўладу закончылася. Замест працяглага міжкланавага сутыкнення ў Туркменістане адбыўся маленькі палацавы бліцкрыг.

Як гэта ні парадаксальна, але нават не падрыхтаваўшы пераемніка, Ніязаў у чымсьці сам запраграмаваў развіццё падзеяў менавіта паводле сцэнару бліцкрыга. Пры адсутнасці асяродкаў, здольных распачаць хоць бы міжфракцыйную барацьбу, уладнай эліце (якая за памерлым уладаром мала чым адрознівалася сваім статусам ад гарэма) даводзіцца адразу ж пагаджацца на фізічную і фінансавую залежнасць ад новага ўладара. Пры такім раскладзе трансфармацыйны максімум Туркменістана на бліжэйшую перспектыву – гэта пераход да карымаўскага рэжыму ў Узбекістане: з такім самым Туркменбашы, толькі без панскіх прыхамацяў папярэдніка кшталту перайменавання месяцаў ды барацьбы з залатымі зубамі.

Нарэшце, падабенстваў паміж Кубай і Туркменістанам аказалася больш, чым можна было чакаць. Інстынкт самазахавання дыктатураў і сатрапій аднолькава спрацоўвае ў розных культурных і палітычных варунках. Пры ўмове кансалідацыі сілавых структураў і канцэнтрацыі кантролю як

за карнымі, так і за фінансавымі рэсурсамі ў адных руках, папярэдняга вынішчэння патэнцыйных асяродкаў апазіцыі, падаўлення ці выціскання нязгодных за межы краіны сістэма не дае збояў нават пры раптоўным, нечаканым развіцці падзеяў. Няма сумневу, што і гэтыя дыктатуры калі-небудзь зруйнуюцца. Але іхні лёс і працягласць існавання зусім не абавязкова звязаныя з лёсам і працягласцю жыцця тых, хто над імі пануе. Так што, тым, хто жадае сваім народам свабоды, падставаў разлічваць на форс-мажор застаецца ўсё меней: можа, не ў кожнага Фідэля ёсць свой Рауль, а тое, што ў кожнага Ніязава ёсць свой Рэджэпаў – гэта дакладна.

[image]

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.

Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2007/03/22

[image]

ГАНС-ГЕОРГ ВІК (нар. у 1928) – палітычны дзеяч. У 1997–2001 гг. – кіраўнік Кансультацыйна-назіральнай групы АБСЭ ў Беларусі. Старшыня аб'яднаньня «Правы чалавека ў Беларусі». Гэты пераклад друкуецца з ласкавага дазволу аўтара і часопісу «Osteuropa».

Ганс-Георг Вік
Як выйсьці зь беларускага тупіка?

У Беларусі прэзыдэнт Лукашэнка зь ягонай прэзыдэнцкай адміністрацыяй і залежнай ад яго выканаўчай і судовай уладамі дамінуе ў палітычным і грамадзкім жыцьці краіны. Ён перасьледуе апазыцыйныя партыі і незалежныя мас-мэдыі і дазваляе іх толькі як маргінальныя зьявы. Рэжым пагарджае эўрапейскімі крытэрамі дэмакратычнага ладу і правоў чалавека. У 1996-м Лукашэнка скасаваў дэмакратычную беларускую Канстытуцыю, а ў 2004-м пры дапамозе чарговага зьмяненьня Канстытуцыі стварыў сабе магчымасьць абірацца на пасаду прэзыдэнта неабмежаваную колькасьць разоў.

Беларусь - адзіная краіна Эўропы, якая не зьяўляецца чальцом Рады Эўропы. Эўрапейскі Зьвяз і АБСЭ ў 1997-м увялі палітычныя і эканамічныя санкцыі супраць Беларусі і ўзнавілі іх пасьля змадэляваных прэзыдэнцкіх выбараў у сакавіку 2006-га.

У 1997 г. у Менску была створаная Кансультацыйна-назіральная група АБСЭ, пакліканая спрыяць укараненьню дэмакратычных інстытутаў і назіраць за захаваньнем крытэраў АБСЭ што да дэмакратыі і правоў чалавека. Падчас сустрэчы на найвышэйшым узроўні кіраўнікоў і ўрадаў дзяржаваў АБСЭ ў

лістападзе 1999 г. у Стамбуле прэзыдэнт Лукашэнка сваім подпісам пацьвердзіў перад міжнароднай супольнасьцю абавязак перайсьці да дэмакратыі.

Насуперак гэтаму Лукашэнка адмовіўся выконваць патрабаваньні ЭЗ што да дэмакратычных рэформаў і захаваньня правоў чалавека, асабліва ў палітычнай сфэры. Палітычная і грамадзкая апазыцыя безабаронная перад ягоным самавольствам і патрабуе больш, чым толькі дэклярацыйнай міжнароднай салідарнасьці і падтрымкі.

ЭЗ і асобныя эўрапейскія ўрады падтрымлівалі праекты рэформаў, распрацаваныя місіяй АБСЭ ў Беларусі ў 1997-2001 гг., аднак пасьля абмежаваньня мандату АБСЭ ў 2003 г. пазбавіліся магчымасьці працягваць гэтую падтрымку. Беларускай грамадзянскай супольнасьці не хапае ня столькі эўрапейскай салідарнасьці з уцісканымі дэмакратычнымі сіламі ў Беларусі, колькі эфэктыўнай матэрыялізацыі гэтай салідарнасьці ў рэальную падтрымку.Толькі частка фінансавых сродкаў, прадугледжаных для Беларусі ў рамках супольнай праграмы TACIS для спрыяньня дэмакратызацыі, пабудове праўнай дзяржавы і трансфармацыі да рынкавай эканомікі ў постсавецкіх дзяржавах, выдаткоўваецца для праектаў у галіне дэмакратыі і правоў чалавека без удзелу беларускіх уладаў.

З гледзішча палітычнай і грамадзкай апазыцыі, беларускай грамадзянскай супольнасьці не хапае ня столькі эўрапейскай салідарнасьці з уцісканымі дэмакратычнымі сіламі ў Беларусі, колькі эфэктыўнай матэрыялізацыі гэтай салідарнасьці ў рэальную падтрымку.

Гэтая крытыка справядлівая. У гэтым артыкуле я пакажу, якім чынам ЭЗ можа больш дзейсна, чым раней, і з прыцэлам на шырэйшую пэрспэктыву выканаць свой палітычны абавязак - падтрымліваць дэмакратызацыю Беларусі. Перадумовай ёсьць тое, што эўрапейская супольнасьць дзяржаваў у значна большай меры, чым дагэтуль, павінна рабіць стаўку на супрацу з грамадзянскай супольнасьцю, а не на бясплённы дыялёг з рэжымам Лукашэнкі, як даўней.

Сфармуляванае шмат гадоў таму патрабаваньне канцэптуальна

прадуманай, ініцыятыўнай падтрымкі палітычных мэтаў грамадзянскай супольнасьці Беларусі асабліва тычыцца тых дзяржаваў - удзельніц ЭЗ, якія дагэтуль праяўлялі нерашучасьць і абмежаваную фінансавую і палітычную актыўнасьць у яго рэалізацыі, хоць недахопу ў афіцыйных дэклярацыях салідарнасьці з грамадзянскай супольнасьцю і крытыцы рэжыму Лукашэнкі не было. Нягледзячы на сваю палітычную салідарнасьць з мэтамі апазыцыі ў Беларусі - як і ў іншых краінах Усходняй Эўропы - Эўрапейскі Зьвяз і бальшыня дзяржаваў-удзельніц дагэтуль аддаюць перавагу дыялёгу з адпаведнымі рэжымамі, намагаючыся схіліць іх да істотных рэформаў і ў сфэры правоў чалавека і дэмакратыі.

ПАДТРЫМКА ДЭМАКРАТЫІ ЎВА ЎСХОДНЯЙ ЭЎРОПЕ: РОЛЯ КБСЭ/АБСЭ

Мэты дэмакратызацыі дзяржаваў Усходняй і Цэнтральнай Эўропы пасьля крушэньня камунізму задаваліся дакумэнтамі Канфэрэнцыі па бясьпецы й супрацы ў Эўропе (КБСЭ) у сфэры чалавечага вымярэньня і правоў чалавека, падпісанымі ў чэрвені 1990-га ў Капэнгагене[1] і ў лістападзе 1990-га ў Парыжы[2].
У парыскай хартыі ўрады ўсходнеэўрапейскіх дзяржаваў заявілі пра сваю прыхільнасьць да дэмакратычнага парадку і абавязаліся правесьці адпаведныя рэформы. Хартыя тычыцца асноўныя пытаньні грамадзкага і палітычнага ладу, чалавекам забесьпячэньне правоў асобы ў грамадзянскай супольнасьці. Дадатковы дакумэнт утрымлівае дэталі, напрыклад, пра арганізацыю Бюро па свабодных выбарах (з 1992-га Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека).
Капэнгагенскі дакумэнт прадугледжвае вымярэньне КБСЭ ад чэрвеня 1990-га[3] адкрэсьлівае, у шэрагу іншага, значэньне справядлівых і свабодных выбараў[3].

[1] Капэнгагенская сустрэча па чалавечым вымярэньні КБСЭ, 29.6.1990.
[2] Парыская хартыя, 21.11.1990.
[3] Капэнгагенскі дакумэнт, 29.6.1990, п. 11, пункт (1) (7.7).

Аднак некаторыя дзяржавы былога СССР ня выканалі гэтага міжнароднага забавязаньня ці выканалі яго толькі фармальна. Міжнародныя назіральнікі за выбарамі Эўрапейская супольнасьць дзяржаваў у значна большай меры, чым дагэтуль,

павінна рабіць стаўку на супрацу з грамадзянскай супольнасцю, а не на бясплённы дыялёг з рэжымам Лукашэнкі, як даўней.маюць толькі абмежаваныя магчымасьці для фіксацыі магчымых парушэньняў парадку правядзеньня выбараў.

Эфэктыўны кантроль за ўсім выбарчым працэсам магчымы толькі шляхам стварэньня мясцовай сеткі назіраньня за выбарамі. Такую сыстэму з прычыны адсутнасьці фінансавых і арганізацыйных перадумоваў у постсавецкіх дзяржавах можна арганізаваць толькі зь міжнароднай дапамогай.

Падчас прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г. у Беларусі існавала разгалінаваная сетка незалежных мясцовых назіральнікаў за выбарамі. Пасьля Лукашэнка адміністрацыйным і заканадаўчым шляхам пачаў сыстэматычна звужаць іхную свабоду дзеяньняў, зрабіўшы іхную дзейнасьць практычна немагчымай.

Гэтак жа грунтоўна, як свабодныя выбары, у парыскіх і капэнгагенскіх дакумэнтах разглядаюцца комплексы пытаньняў «Дэмакратычны лад», «Незалежнасьць праўнай сыстэмы», «Абарона мяншыняў» і «Рынкавая эканоміка».

Роля АБСЭ ў падтрымцы пераходу да дэмакратыі за апошняе дзесяцігодзьдзе зьмянілася. Пры пераўтварэньні КБСЭ ў сталую арганізацыю - АБСЭ зь яе Сталай радай - захаваўся прынцып кансэнсусу: рашэньні аб захадах АБСЭ могуць прымацца толькі са згоды ўрадаў краін-удзельніц, мінус адзін голас, а наймя краіны, якой датычыць пастанова. Таму калі ў асобных дзяржавах, перадусім ува Ўсходняй Эўропе, пачаўся палітычны, а значыць і афіцыйны супраціў дэмакратызацыі, АБСЭ і ейныя органы ў вялікай меры згубілі дзеяздольнасьць у гэтай далікатнай сфэры. Гэта прывяло да значнага зьніжэньня аўтарытэту і аслабленьня здольнасьці АБСЭ рэалізаваць уласныя рашэньні. Гэта павялічвае небясьпеку таго, што Эўропа так і ня стане супольнасьцю каштоўнасьцяў і застанецца супольнасьцю інтарэсаў.

Палітычнай процівагай абмежавана дзеяздольнай Сталай радзе стала Парлямэнцкая асамблея АБСЭ, на якой бальшынёй

галасоў сапраўды прымаюцца крытычныя рашэньні аб парушэньні дэмакратыі ў асобных дзяржавах-сябрах.

Ад 1992 г. АБСЭ, на жаль, вымушаная займацца пераважна антыкрызісным мэнэджмэнтам. Тым часам падтрымка дэмакратызацыі ўва Ўсходняй Эўропе адсунулася на задні плян.

ПРАБУКСОЎКА ДЭМАКРАТЫІ ЎВА ЎСХОДНЯЙ ЭЎРОПЕ

Палітычны рэжым Беларусі - не адзіны ўва Ўсходняй Эўропе, які намагаецца павярнуць назад працэс дэмакратычнай трансфармацыі і рэалізаваць канцэпты моцнай дзяржавы і кіраванай дэмакратыі. Пры такіх аўтарытарных сыстэмах у найлепшым выпадку апазыцыйным сілам дазваляюць легальна існаваць, але найчасьцей іх перасьледуюць.

У Беларусі яшчэ выразьней, чым у Расеі, праявілася тэндэнцыя да пабудовы нэасавецкай, аўтарытарнай паліцыйнай дзяржавы. Абраны ў 1994 г. на падставе дэмакратычнай Канстытуцыі Аляксандар Лукашэнка неўзабаве зрабіў усё, каб скасаваць падзел уладаў і ў лістападзе 1996 г. пры дапамозе змадэляванага рэфэрэндуму дабіўся прыняцьця Канстытуцыі, якая канцэнтравала ўсю ўладу ў руках прэзыдэнта дзяржавы. У 2004-м шляхам яшчэ аднаго рэфэрэндуму ён узаконіў магчымасьць неабмежаванага паўторнага абраньня асобы, якая займае прэзыдэнцкую пасаду. Усе гэтыя гульні з Канстытуцыяй адбываліся з маўклівай згоды Масквы, тым часам як Захад - Эўрапейскі Зьвяз, Рада Эўропы, Парлямэнцкая асамблея АБСЭ, а таксама Злучаныя Штаты - увёў санкцыі супраць рэжыму Лукашэнкі і нагадаў пра неабходнасьць ажыцьцяўленьня сапраўдных дэмакратычных рэформаў грамадзтва і дзяржавы.

Там, дзе перадусім дзякуючы дапамозе ЗША былі пабудаваныя эфэктыўныя мясцовыя структуры назіраньня за выбарамі і адбыліся так званыя «каляровыя рэвалюцыі» - у Грузіі і Ўкраіне, - сёньня таксама назіраецца прабуксоўка з правядзеньнем далейшых дэмакратычных рэформаў у дзяржаве і грамадзтве. У

Грузіі бяруць верх кланавыя групоўкі, якія патрабуюць аўтарытарнага стылю кіраваньня, што з увагі на моцны ўплыў Расеі на працэсы ўнутры краіны ў пэўнай меры зразумела. Ува Ўкраіне пасьля пераканаўчай перамогі на выбарах прэзыдэнта Віктара Юшчанкі ў сьнежні 2004-га новая Канстытуцыя, якая ўзмацняе правы парлямэнту за кошт паўнамоцтваў прэзыдэнта, стала тормазам дэмакратызацыі ў сфэрах заканадаўства, дзяржаўнай адміністрацыі і эканомікі. Пасьля перамогі прарасейскіх сілаў на парлямэнцкіх выбарах 2006 г. ува Ўкраіне паўстала кааліцыя канфліктоўных палітычных сілаў, што робіць менш верагоднымі рэформы згодна з крытэрамі ЭЗ і больш верагоднымі - саступкі расейскім інтарэсам.

Пакуль няма падмацаванай надзеі на сяброўства ў ЭЗ і НАТО, дэмакратычныя і рынкава эканамічна арыентаваныя сілы ўва Ўкраіне і іншых дзяржавах былога СССР вымушаныя абараняцца, бо толькі гэтая пэрспэктыва - як праўдападобная альтэрнатыва іначай непазьбежнай прывязцы да Расейскай Фэдэрацыі і ў канцавым выніку стратэгічнай залежнасьці ад Масквы - можа даць неабходны стымул рэфармісцкім сілам унутры краіны. Шлях у Эўропу можа быць доўгі, аднак патрабуецца імаверны сыгнал аб тым, што сябры Эўрапейскага Зьвязу прызнаюць пояс краінаў паміж Балтыйскім і Чорным морамі, паміж Расейскай Фэдэрацыяй і сёньняшнімі межамі ЭЗ за дзяржавы, якія безумоўна змогуць стаць сябрамі ЭЗ пры выкананьні папярэдніх умоваў. Пагляд у гісторыю гэтых народаў падкрэсьлівае іх шматвекавую прыналежнасьць да заходнеэўрапейскага культурнага кола. Прабуксоўка ў дэмакратычнай трансфармацыі тлумачыцца перадусім нежаданьнем аўтарытарных рэжымаў уступаць на гэты шлях ці рэпрэсіямі супраць насельніцтва, якое пры іх адсутнасьці зрабіла б хутчэй празаходні, чым праўсходні выбар.

ЧАМУ ПРАБУКСОЎВАЕ ПАДТРЫМКА НЯМЕЧЧЫНАЙ ДЭМАКРАТЫІ ЎВА ЎСХОДНЯЙ ЭЎРОПЕ?

З пагаршэньнем пэрспэктываў пераходу да дэмакратыі амаль ува ўсіх дзяржавах былога СССР нямецкія ўрадавыя агенцыі і

ўстановы палітычнай адукацыі, у тым ліку палітычныя фундацыі, здаецца, прызналі сваё бясьсільле. На жаль, можна канстатаваць, што яны амаль цалкам адмовіліся ад працы для ўсебаковай, канкрэтнай і сыстэматычнай падтрымкі дэмакратычных сілаў ува Ўсходняй Эўропе.

Праграмы TRANSFORM фэдэральнага ўраду практычна завершаныя, дый так яны засяроджваліся пераважна, калі не выключна, на рэформе дзяржаўных органаў і нормаў заканадаўства[4].

Аўтарытэтны «Нямецка-расейскі форум», у задачы якога ў ліку іншага ўваходзіць правядзеньне «Пецярбурскага дыялёгу» грамадзянскіх супольнасьцяў, разглядаецца абодвума бакамі як форум для дыялёгу паміж арганізацыямі, якія падтрымліваюцца дзяржавай, і таму не надаецца на ролю круглага стала для грамадзкіх сілаў з рознымі інтарэсамі. Нават праграмы гуманітарнай дапамогі, накшталт дапамогі ахвярам чарнобыльскай катастрофы, у такой краіне, як Беларусь, сутыкаюцца з істотнымі цяжкасьцямі.Асобныя агенцыі займаюцца асобнымі праектамі ў рамках тэхнічнага супрацоўніцтва. Свабода дзеяньняў палітычных фундацыяў і НДА ўва Ўсходняй Эўропе вагаецца ў межах, якія вызначаюцца іх уласнымі мэтамі, даступнымі ім сродкамі і той мерай, у якой адпаведныя рэжымы схільныя цярпець іхную дзейнасьць.

Нават праграмы гуманітарнай дапамогі, накшталт дапамогі ахвярам чарнобыльскай катастрофы, у такой краіне, як Беларусь, сутыкаюцца з істотнымі цяжкасьцямі. Улады з недаверам глядзяць на праграмы праваабарончых і іншых недзяржаўных арганізацыяў накшталт «Нямецка-расейскага абмену» ці падтрыманых царквой структураў накшталт «Дыяканічнай працы» (*Diakonischen Werk*) ці *Renovabis*. «Менскі форум», які ўжо шмат гадоў праводзіцца Нямецка-беларускім таварыствам у фінансаваным Нямеччынай Міжнародным адукацыйным цэнтры (*Internationalen Bildungs- und Begegnungsstätte, IBB*, IBB) у Менску, хоць і адбываецца надалей, аднак беларускае Міністэрства замежных справаў сартуе нямецкіх удзельнікаў на пажаданых і непажаданых, адсейваючы непажаданых пры выдачы візаў, а само ўжо не бярэ

4. У рамках праграмы TRANSFORM, за вялікаю ахвяраю дапамогі Фэдэральнае міністэрства эканамічнай супрацоўніцтва (Bundesministerium für wirtschaftliche Zusammenarbeit und Entwicklung, BMZ), фэдэральны ўрад ад пачатку 1990-х гг. падтрымлівае пераход да рынкавай эканомікі і дэмакратыі ў Польшчы,

ўдзелу ў форуме[5].

Літве, Латвіі, Славаччыне, Расеі, Беларусі й Украіне. Праекты ў Эстоніі, Чэхіі, Славеніі і Вугоршчыне тым часам былі завершаныя. Параўн.

Аднак праблема палягае таксама і ў НДА і фундацыях. Пасьля палітычных трансфармацыяў пачатку 1990-х гг. нямецкія палітычныя фундацыі так і не распрацавалі стратэгічнай канцэпцыі для выкананьня важных адукацыйных задачаў у рамках падтрымкі дэмакратычных рэфарматарскіх сілаў у грамадзянскіх супольнасьцях Усходняй Эўропы. Як правіла, яны робяць пунктавыя захады, каб паказаць сваю прысутнасьць, ствараць пэрсанальныя сеткі і распрацоўваць дакументы для ўласнай ацэнкі падзеяў у гэтай частцы «супольнага дому Эўропы». З увагі на маштаб задачы, якую трэба рашаць, гэтыя абмежаваныя мэты трэба прызнаць недастатковымі. Стратэгічная канцэпцыя павінна акрэсьліваць пэрспэктывы гэтых краінаў на падставе супольных каштоўнасьцяў, пацьверджаных у 1990-м у Парыжы, прадугледжваць узгодненыя зь іншымі палітычнымі фундацыямі праграмы, нават супольныя ініцыятывы, і распрацоўваць інструмэнты, якія б дазвалялі сыстэматычна ўзмацняць яшчэ слабыя дэмакратычныя і грамадзкія сілы (мас-мэдыі, палітычнае кансультаваньне, пабудова сетак назіраньня за выбарамі, разьвіцьцё міжнародных сувязяў).

Недахоп стратэгічнай актыўнасьці, напэўна, тлумачыцца таксама й тым, што палітычныя фундацыі не атрымлівалі маральнай і фінансавай падтрымкі ў справе распрацоўкі стратэгічнай, фінансава затратнай канцэпцыі падтрымкі

[5] У Польшчы «Мелкія фонды» ўзяў у дзел старшыня т. зв. Сяйму, Ўнаўзіляр Конаплёў. – Рэд.

дэмакратыі ўва Ўсходняй Эўропе ані з боку фэдэральнага ўраду Нямеччыны, ані з боку нямецкага бундэстагу.

Накіды такой канцэпцыі для Беларусі на эўрапейскім узроўні ўжо былі зробленыя. Падчас маёй чатырохгадовай працы ў якасьці кіраўніка Кансультацыйна-назіральнай групы АБСЭ ў Менску я браў удзел у шматлікіх міжнародных канфэрэнцыях, арганізаваных заходнімі фундацыямі, дзе абмяркоўваліся праграмы для Беларусі ў сфэрах дэмакратыі, правоў чалавека і адукацыі і ішоў абмен думкамі пра становішча на месцы. На іх прысутнічалі назіральнікі ад улады, часам таксама прадстаўнікі міністэрстваў ці амбасадаў, якія ажыццяўлялі праграмы супрацоўніцтва зь Беларусьсю. Удзельнічалі асобныя прадстаўнікі палітычных фундацыяў.

Распрацоўка стратэгіяў усебаковага кансультаваньня палітычных і грамадзкіх сілаў у Беларусі з мэтай даць новы імпульс пераходу да дэмакратыі знутры самога беларускага грамадзтва вялася і ў зьвязку зь дзейнасьцю Кансультацыйна-назіральнай групы АБСЭ ў Менску. Згадка пра іх ёсьць у заключнай дэклярацыі стамбульскай сустрэчы АБСЭ на найвышэйшым узроўні ў лістападзе 1999 г., якая была падпісаная таксама й прэзыдэнтамі Расейскай Фэдэрацыі і Беларусі. У гэтай дэклярацыі партнэрамі па дыялёгу зь беларускімі ўладамі называюцца канкрэтныя апазыцыйныя палітычныя партыі[6] - апазыцыя, якая пасьпяхова аб'ядналася ў Каардынацыйную раду для распрацоўкі лініі перамоваў. Праекты місіі АБСЭ фінансава падтрымлівалі некалькі ўрадаў, у тым ліку фэдэральны ўрад Нямеччыны.

Пасьля таго як гэтая дзейнасьць АБСЭ ў канцы 2001 году пад ціскам Лукашэнкі была спыненая, падтрымка дэмакратычнай асабліва палітычнай апазыцыі ў Беларусі з боку фэдэральнага ўраду Нямеччыны, Эўрапейскага Зьвязу, палітычных фундацыяў у стратэгічным пляне была згорнутая. Ажыццяўляліся адно дробныя праекты маргінальнага палітычнага значэньня. Лукашэнку без праблемаў удалося разбурыць палітычную структуру апазыцыі ў Беларусі.

[6] Дэкларацыя стамбульскай сустрэчы на найвышэйшым узроўні, 19.11.1999, пункт 22; .

СУПРАЦА З АПАЗЫЦЫЯЙ ЗАМІЖ ДЫЯЛЁГУ З

РЭЖЫМАМ

ЭЗ, фэдэральны ўрад Нямеччыны і бальшыня палітычных фундацыяў, намагаючыся ўжываць пакрокавую стратэгію для дасягненьня дэмакратычных рэформаў і адначасна палепшыць двухбаковыя дачыненьні, зрабілі стаўку на дыялёг з Лукашэнкам і апаратам ягонай улады. Новая стратэгія супрацы з апазыцыйнымі палітычнымі сіламі распрацаваная не была. На падтрымку грамадзянскай супольнасьці выдзяляліся пэўныя сродкі, але на пярэднім пляне стаялі непалітычныя тэмы. Да 2006 г. гэтае палажэньне істотна не зьмянілася. Эўрапейская камісія да таго ж выкрасьліла Беларусь са сьпісу прыярытэтных краінаў для ажыцьцяўленьня праграмаў у сфэры дэмакратыі і правоў чалавека (да кастрычніка 2005-га). Тым ня менш, ЭЗ зьвяртаўся да беларускага рэжыму з заклікамі правесьці дэмакратычныя рэформы, якія зрабілі б магчымай распрацоўку двухбаковых праграмаў супрацы паміж ЭЗ і Беларусяй у рамках канцэпцыі эўрапейскай палітыкі добрасуседзтва (*Europäische Nachbarschaftspolitik, ENP*). Гэтыя заклікі, аднак, не атрымалі пазытыўнага рэзанансу.

Ад пэўнага часу, тым ня менш, зьявіліся першыя ініцыятывы, скіраваныя на ўзмацненьне актыўнасьці палітычных фундацыяў і Эўрапейскай камісіі ў Беларусі, у якіх стаўка робіцца на падтрымку беларускай грамадзянскай супольнасьці і супрацу з палітычнай і грамадзкай апазыцыяй. Пытаньне, аднак, палягае ў тым, ці стане гэты нерашучы пачатак чымсьці большым. Гэта цяжка спрагназаваць. У любым выпадку, ЗША надалей будуць уважаць нястачу дэмакратыі за нагоду для актыўнай падтрымкі апазыцыі, уцісканай у Беларусі.

Палітычная і арганізацыйная стрыманасьць эўрапейскай супольнасьці дзяржаваў, магчыма, мае замежнапалітычныя прычыны. Важным чыньнікам, безумоўна, ёсьць улік інтарэсаў Расейскай Фэдэрацыі. Разам з адсутнасьцю канцэпцый у фундацыях і чыноўніцкіх кабінэтах, безумоўна, пэўную ролю адыгрывае асьцярога, што падтрымка дэмакратыі ў Беларусі і іншых ўсходнеэўрапейскіх краінах можа абудзіць ілюзіі што да іх будучага сяброўства ў ЭЗ і істотнай фінансавай падтрымкі ўнутраных рэформаў. Некаторыя ўвогуле сумняюцца ў

здольнасьці дзяржаваў былога Савецкага Саюзу перайсьці да дэмакратыі. Не зважаючы на міжнароднае забавязаньне правесьці дэмакратычныя рэформы, якое ўзялі на сябе ўсходнеэўрапейскія дзяржавы, заходнія інстытуцыі не сьпяшаюцца, у выпадку адваротнай дынамікі ў асобных краінах, як, напрыклад, у Беларусі, наўпрост падтрымаць сілы палітычнай апазыцыі.

АДСУТНАСЬЦЬ КАНЦЭПЦЫІ ПАДТРЫМКІ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЬЦІ Ў БЕЛАРУСІ

У нас дамінуе мысьленьне ў дзяржаўных катэгорыях і ў катэгорыях міжнародных дачыненьняў. Мысьленьне і актыўнасьць у катэгорыях грамадзкіх панаддзяржаўных структураў у сфэры дэмакратыі і правоў чалавека, наадварот, застаецца недаразьвітым. Дэмакратычныя сілы, настроеныя крытычна да рэжымаў у Расеі і ў Беларусі, могуць лёгка ўспрыняць Для палітычнай апазыцыі ў Беларусі збольшага галаслоўная салідарнасьць уласных суседзяў у Эўропе і эўрапейскіх арганізацыяў – балючы досьвед.дагэтулешні дэфіцыт як нямецкіх, так і эўрапейскіх супольных канцэпцыяў як рэвэранс Эўрапейскага Зьвязу і дзяржаваў - сяброў ЭЗ, не ў апошнюю чаргу таксама й Нямеччыны, перад паноўнымі ў Маскве і ў Менску аўтакратамі, як здраду дэмакратычных каштоўнасьцяў на карысьць палітычных ці эканамічных дзяржаўных інтарэсаў.

Было б пажадана, каб палітычныя фундацыі разам за круглым сталом грунтоўна разгледзелі б комплекс пытаньняў у справе сыстэматычнай падтрымкі дэмакратыі ў Беларусі і дамовіліся б пра супольныя захады ў імя трывалай і дзейснай падтрымкі дэмакратыі. Іх абавязкова трэба ўзгадніць з урадам і парлямэнтам. Ці дапаможа гэта распрацаваць канцэпцыю, якая заслугоўвала б такой назвы, канцэпцыю, якая была б заснаваная не на супрацы з уладамі адпаведнай краіны, а найперш з дэмакратычна настроенымі часткамі грамадзянскай супольнасьці, застаецца адкрытым пытаньнем.

Магчыма, ЗША лягчэй, чымся эўрапейскім суседзям Расеі і

Беларусі, выкарыстоўваць уласны палітычны прэстыж і фінансавыя сродкі для палітычна і стратэгічна прадуманай падтрымкі грамадзянскай супольнасьці ў Беларусі, ідучы тым самым на замежнапалітычныя і эканамічныя выдаткі, а таксама на рызыку выклікаць рэзкую крытыку з боку Масквы і Менску за ўмяшаньне ўва ўнутраныя справы краіны. Калі для ЭЗ і дзяржаваў - сяброў ЭЗ у іх палітычнай і фінансавай актыўнасьці ўва Ўсходняй Эўропе найважнейшым ёсьць набор абавязковых дэмакратычных каштоўнасьцяў у «супольным доме Эўропе», у выпадку ЗША значэньне маюць таксама і іншыя, а наймя стратэгічныя мэты. Акурат дзеля гэтага самастойная эўрапейская палітыка ў справе падтрымкі дэмакратыі не павінна заставацца ў абсягу рыторыкі, але мусіць утрымліваць рэальныя дзеяньні.

Круці ні круці, для палітычнай апазыцыі ў Беларусі збольшага галаслоўная салідарнасьць уласных суседзяў у Эўропе і эўрапейскіх інстытуцыяў (ЭЗ, Рады Эўропы, Парлямэнцкай асамблеі АБСЭ) - балючы досьвед. Здаецца, што нашыя лідэры палітычнай думкі і вызначальнікі палітычных рашэньняў вельмі мала на гэта зважаюць.

ПАДТРЫМКА ДЭМАКРАТЫІ ЎВА ЎСХОДНЯЙ ЭЎРОПЕ
À L'AMERICAINE I À L'EUROPÉENNE

Падтрымка дэмакратыі Эўропай дагэтуль была арыентаваная на вынікі не ў кароткатэрміновай, а ў доўгатэрміновай пэрспэктыве. У артыкуле аб ролі палітычнай адукацыйнай працы і падтрымкі грамадзянскай супольнасьці ў рамках падтрымкі дэмакратыі ўва Ўсходняй і Сярэдняй Эўропе Матыяс Фрайзэ канстатуе:

Палітычная адукацыя займае асаблівае месца сярод інструмэнтаў вонкавай падтрымкі дэмакратыі ў постсацыялістычных грамадзтвах Усходняй і Сярэдняй Эўропы. Калі спачатку праца замежных арганізацыяў засяроджвалася на кансультаваньні ў сфэры дэмакратычных выбарчых працэдураў, парадкаў і праўных сыстэмаў, а таксама палітычных партыяў,

то самае позьняе з паловы 1990-х гг. у цэнтры ўвагі апынулася грамадзянская супольнасьць. За гэтым стаіць наступнае прыпушчэньне: адных дэмакратычных інстытутаў і працэдураў ні ў якім выпадку не дастаткова для таго, каб ператварыць былыя аўтакратыі ў лібэральна-дэмакратычныя сыстэмы. Для гэтага трэба нашмат больш: палітычная культура, сфармаваная дэмакратычнымі каштоўнасьцямі і спосабамі паводзінаў, якая надае легітымнасьць новай дэмакратычнай сыстэме; моцная сыстэма аб'яднаньняў і таварыстваў, на якую абапіраецца дэмакратычная кансалідацыя, а таксама высокая ступень грамадзянскай актыўнасьці. І гэтага можна дасягнуць толькі з дапамогай палітычнай адукацыйнай працы[7].

Са зьместам гэтага выказваньня, у прынцыпе, можна пагадзіцца. Аднак трэба падкрэсьліць, што пасьпяховая палітычная адукацыйная праца зь людзьмі і арганізацыямі іншых краінаў магчымая толькі праз дыялёг і не павінна адбывацца па накінутым звонку, квазішкольным навучальным пляне.

ЗША, стварыўшы ў 1980-х гг. на дзяржаўныя сродкі фундацыю *National Endowment for Democracy* і такія ейныя агенцыі, як *International Republican Institute* (IRI) і *National Democratic Institute for International Affairs* (NDI), стварылі інстытут, пакліканы праз мэтаскіраваную падтрымку ўзмацняць у недэмакратычных дзяржавах свабодную прэсу, незалежнасьць праўнай сыстэмы, самастойныя палітычныя партыі, а таксама распрацоўваць дэмакратычныя канцэпцыі для грамадзянскай супольнасьці і для дзяржаўных органаў. Створаныя пры дапамозе гэтага інстытуту незалежныя агульнанацыянальныя сыстэмы назіраньня за выбарамі маюць вырашальнае значэньне для палітычнай барацьбы дэмакратычных сілаў у аўтарытарных краінах. З гэтай мэтай амэрыканскія арганізацыі прыцягваюць ува Ўсходнюю Эўропу таксама спэцыялістаў з Цэнтральнай і Паўднёвай Эўропы, і пакуль дасягалі пры дапамозе гэтых мэтадаў досыць паважных посьпехаў[8].

Вінфрэд Шнайдэр-Дэтэрс крытычна ацэньвае падыход нямецкіх палітычных фундацыяў, у параўнаньні да стратэгіі амэрыканскіх *foundations*, да праблемы падтрымкі дэмакратыі ў

[7] Freise, Matthias. Demokratie-Bildung. Die Forderung der Zivilgesellschaft in Ostmitteleuropa // OSTEUROPA. 2005. № 8 (= Europa Bilden. Politische Bildung zwischen Ost und West). S. 83–95, [тут] S. 83.

[8] У 1999–2001 гг. мінімум АБСЭ

ўва Ўсходняй Эўропе:

Трэба самакрытычна прызнаць, што там, дзе ў выніку непрыхаванай пагарды да волі выбаршчыкаў канфлікт паміж аўтакратычным рэжымам і дэмакратычнай апазыцыяй набывае выбуховы характар і абвастраецца да рэвалюцыйнай сітуацыі, амэрыканскую канфрантацыйную стратэгію [падтрымкі мясцовых партнэрскіх НДА, апазыцыйных да рэжыму, толькі ўмоўна легітымных з дэмакратычнага гледзішча] можна расцаніць як эфэктыўную, а скіраваную на кампраміс паміж нямецкіх палітычных фундацыяў [г. зн. заклікі да супрацы паміж дзяржавай і няўрадавым сэктарам] хутчэй як апартунісцкую. Гэта тычыцца падзеяў у Грузіі ўвосень 2003-га і ўва Ўкраіне ўзімку 2004-га. Перамогу спантаннага пратэсту там забясьпечылі навучаныя амэрыканскімі інстытутамі групы; нямецкія ж палітычныя фундацыі не адыгралі ніякай ролі[9].

З гэтай ацэнкай можна цалкам пагадзіцца. Пасьля правалу «каляровых рэвалюцыяў» ува Ўкраіне і Грузіі нямецкая Фундацыя Бэртэльсмана разам з амэрыканскай *Open Society* распрацавала ініцыятыву ў справе Беларусі, каб яшчэ да парлямэнцкіх выбараў у Беларусі ў 2004 г. і прэзыдэнцкіх выбарах у 2005-м схіліць ЭЗ да ініцыятыўнай палітыкі ў тамтэйшай грамадзянскай супольнасьці. Аднак гэтая ініцыятыва ані ў ЭЗ, ані ў Бэрліне, ані ў палітычных крыніцах не прывяла да ўзмацненьня стратэгічнай актыўнасьці ў падтрымкі дэмакратыі ўва Ўсходняй Эўропе ці ў Беларусі. Былі распачатыя пэўныя дзеяньні, напрыклад, падтрымка трансьляваных на Беларусь радыё- і тэлепраграмаў, арганізацыя візытаў у ЭЗ беларускіх палітыкаў і адмысловых групаў. Апроч таго, Беларусь, як аўтару стала вядомая неафіцыйных крыніцаў, была зноў уключаная ў сьпіс прыярытэтаў Эўрапейскай камісіі для праектаў у сфэры дэмакратыі і правоў чалавека.

Эўрапейскія структуры пачалі крытыкаваць аўтарытарны рэжым пасьля змадэляваных прэзыдэнцкіх выбараў у сакавіку 2006-га. Адпаведны розгалас быў у парлямэнтах і ўрадах дзяржаваў - сяброў ЭЗ. Мужным дэманстрацыям моладзі супраць фальсыфікацыі вынікаў выбараў была выказаная

Беларусі пабудавала незалежна ад ЗША – аб'яднаную мясцовую сыстэму пазіранныя за выбарамі, якая, аднак, пазьней была звінквідаваная Лукашэнкавай адміністрацыяй.

[9] Schneider, Peter, Sofiied Civil Society. Die Politische Stiftungen in Osteuropa // OSTEUROPA. 2005. ą 8 (=Быкоў Bilden. Politische Bildung zwischen Ost und West). S. 107–123, [тут] S. 115.

павага, крымінальны перасьлед дэманстрантаў, назіральнікаў за выбарамі і кандыдатаў на прэзыдэнта быў сурова асуджаны. Былі ўведзеныя санкцыі супраць галоўных асобаў кіроўнай сыстэмы. Але ў пошуках адказу на пытаньне, якім чынам можна дзейсна дапамагчы перасьледаванай апазыцыі, амаль нічога не зьмянілася. Час падганяе, бо ў студзені 2007 г. адбудуцца выбары ў мясцовыя рады, і апазыцыя рыхтуецца да ўдзелу ў іх. Некаторыя з краінаў Цэнтральна-Ўсходняй Эўропы, у прыватнасьці, Польшча і Літва, якія ня так шмат гадоў таму самі прайшлі праз палітычную вызвольную барацьбу, падштурхоўваюць эўрапейскія структуры да больш дзейсных захадаў, а самі яны тым часам адкрыта супрацоўнічаюць з амэрыканскімі НДА.

АБСЭ НА ШЛЯХУ КАНФРАНТАЦЫІ ЗЬ БЕЛАРУСЬСЮ

У Беларусі Кансультацыйна-назіральная група АБСЭ з 1998 да 2001 г. мела мандат, які забясьпечваў ёй досыць вялікую свабоду дзеяньняў[10].
На падставе разьдзелу пра Беларусь згаданай дэклярацыі прэзыдэнтаў і кіраўнікоў урадаў, прынятай на стамбульскай сустрэчы АБСЭ на найвышэйшым узроўні ў 1999 г., група здолела правесьці шэраг важных захадаў для падтрымкі дэмакратыі. Вынікамі яе працы былі:

- арганізацыя разгалінаванай сеткі незалежных беларускіх назіральнікаў за выбарамі;

- дамоўленасьць з уладамі пра правядзеньне паміж уладамі і апазыцыяй перамоваў пра абмежаваную дэмакратычную рэформу пры падтрымцы місіі АБСЭ;

- утварэньне сталай «Кансультацыйнай рады апазыцыйных палітычных партыяў»;

- пастаянная падтрымка незалежных мас-мэдыяў;

- стварэньне тройкі па Беларусі з дэпутатаў Эўрапейскага парлямэнту і Парлямэнцкіх асамблеяў АБСЭ і Рады Эўропы;

[10] Гл.: Wenck, Hans-Georg. Die demokratische Zivilgesellschaft – Alternative zum autokratischen Lukaschenko-Regime in Belarus // OSZE-Jahrbuch 2002. Herausgegeben vom Institut für Friedensforschung und

- дамова паміж Эўрапейскай камісіяй, Бюро АБСЭ па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (ODIHR) і Кансультацыйна-назіральнай групай АБСЭ ў Беларусі праграму падтрымкі дэмакратыі з гадавым бюджэтам каля аднаго мільёна эўра.

Гэтыя захады часткова праводзіліся разам зь беларускім урадам. Нацыянальныя ўрады (напрыклад, Нямеччыны, Нідэрляндаў, Вялікай Брытаніі, Канады) выдзялялі на праекты фінансавыя сродкі.

Аднак гэтая пазытыўная дынаміка сышла на нішто пасьля таго, як Лукашэнка ў 2001 г. даў зразумець эўрапейскім урадам, а таксама на Сакратарыяце АБСЭ, што тадышні кіраўнік Кансультацыйна-назіральнай групы АБСЭ ў Менску, амбасадар Вік, нібыта перавысіў свой мандат. Беларускай заяве пра парушэньне мандату запярэчыў толькі міністар замежных справаў ЗША на сустрэчы міністраў замежных спраўаў АБСЭ ў Бухарэсьце ў лістападзе 2001-га. Пасьля таго, як АБСЭ пагадзілася на істотнае абмежаваньне мандату АБСЭ ў Беларусі, у студзені 2003 г. у Менск быў пасланы новы кіраўнік будучага бюро АБСЭ (*OSCE Office*).

Прычынай адмоўнага стаўленьня прэзыдэнта Лукашэнкі да місіі АБСЭ цалкам відавочна была пабудова сеткі мясцовых назіральнікаў за выбарамі. Гэтак, незадоўга да прэзыдэнцкіх выбараў у спэцыяльным выпуску дзяржаўнай газэты «Советская Белоруссия» тагачасны амбасадар ЗША Майкл Козак і кіраўнік місіі АБСЭ Вік былі публічна абвінавачаныя ў тым, што яны арганізуюць ня толькі назіраньне за выбарамі, але і паўстаньне ў вечар дня выбараў (9 верасьня 2001 г.)[11].

ЯК ВЫЙСЬЦІ З ТУПІКА: ІНІЦЫЯТЫЎНАЯ ЭЎРАПЕЙСКАЯ ПАЛІТЫКА ШТО ДА БЕЛАРУСІ

ЭЗ, урады краінаў-сяброў, а таксама Рада Эўропы надалей рэалізоўвалі старую стратэгію, спрабуючы дамагчыся поступу ў дэмакратызацыі беларускай дзяржавы палюбоўным шляхам, праз дыялёг з Лукашэнкам. Адначасна працяг дзяржаўнага курсу на перасьлед апазыцыі і нават яго абвастрэньне ў зьвязку

Sicherheitspolitik der Universität Hamburg. Baden-Baden, 2002. S. 243–262. [Літ. ж].

Demokratieförderung in Belarus'. Eine harte Nuss für die europäischen Institutionen // OSTEUROPA. 2002. № 7. S. 871–884.

[11] Советская Белоруссия. 2001. 5 сентября.

з выбарамі 2004 і 2006 гг. прымушалі і прымушаюць іх уводзіць новыя санкцыі супраць рэжыму, напрыклад, арыштоўваць рахункі і забараняць уезд чальцам ураду. Сёньня бюро АБСЭ ў Менску можа ажыццяўляць свае праекты толькі з дазволу рэжыму і незалежна ад яго можа толькі інфармаваць Сталую раду АБСЭ пра становішча ў краіне. Эўрапейскія структуры, у першую чаргу Сталая рада АБСЭ, ЭЗ і Рада Эўропы, самі сябе загналі ў палітычны тупік у справе падтрымкі дэмакратыі ў Беларусі. Расея фармуе сваю палітыку да Беларусі, ня раючыся з ЭЗ ці асобнымі дзяржавамі – сябрамі ЭЗ, і такі ж прынцып павінен дзейнічаць таксама і для ЭЗ.Яны апынуліся перад дылемай: альбо яны падтрымліваюць дыялёг з Лукашэнкам і дзеля іншых інтарэсаў адмаўляюцца ад практычнай рэалізацыі маштабных канцэпцый дэмакратычнай трансфармацыі ў Беларусі, альбо яны пасьлядоўна праводзяць канцэптуальна прадуманыя праграмы супольна з палітычнымі і грамадзкімі апазыцыйнымі сіламі ўнутры грамадзянскай супольнасьці, рызыкуючы далейшым пагаршэньнем стасункаў зь беларускім рэжымам.

У Нямеччыне ані ў палітычных фундацыяў, ані ў навуковых інстытутах накшталт Фундацыі навукі і палітыкі (*Stiftung Wissenschaft und Politik*, SWP) ці ў палітычных партыях не відаць намаганьняў выпрацаваць стратэгію сыстэматычнай і ініцыятыўнай падтрымкі палітычнай і грамадзкай апазыцыі ў Беларусі. Гэта ўсё яшчэ, здаецца, застаецца табу. У Нямеччыне ўрад і парлямэнт, таксама як і палітычныя фундацыі і навуковыя інстытуты, па-ранейшаму маюць цьмяныя пярэчаньні супраць стратэгіяў, якія ажыццяўляюцца амэрыканскімі арганізацыямі пад дахам *National Endowment for Democracy* на падставе падпісанага 20 кастрычніка 2004 г. прэзыдэнтам Бушам закону пра Беларусь («Акт аб дэмакратыі ў Беларусі»), зацьверджанага амэрыканскім кангрэсам. На падставе прынятага ў 2004 г. рамкавага закону, ад жніўня 2006-га амэрыканскі кангрэс мае праект бюджэту памерам 40 мільёнаў амэрыканскіх даляраў на падтрымку дэмакратыі ў Беларусі ў 2007-2008 гг.

Між тым Эўрапейскі Зьвяз і ягоныя дзяржавы-сябры вітаюць посьпехі эфэктыўнага ўнутранага назіраньня за выбарамі ў

такіх краінах, як Грузія і Украіна, пабудова і дзейнасьць якога шмат гадоў фінансава і ідэйна падтрымлівалася амэрыканскімі НДА. Эўропа вітала дэмакратычныя прарывы ў гэтых краінах і без сумневу вітала б такі пералом таксама і ў Беларусі, калі б амэрыканскія намаганьні і высілкі палітычнай апазыцыі ў Беларусі прывялі да посьпеху. Але пакуль намі не было зроблена нават дасьледаваньня спосабу дзейнасьці амэрыканскіх арганізацыяў і мэтадаў унутранага назіраньня за выбарамі ў краінах з аўтарытарнымі рэжымамі. Ніводная нямецкая палітычная фундацыя ніколі не распрацоўвала такога праекту для Беларусі ці якой-небудзь іншай краіны Ўсходняй Эўропы. Вясной 2006 г. Эўрапейская камісія ўпершыню абвесьціла пра фінансаваньне ў гэтай сфэры праектаў, якія могуць праводзіцца НДА на тэрыторыі ЭЗ разам з партнэрскімі НДА ў Беларусі бяз згоды беларускага ўраду[12].

Бюро АБСЭ па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (ODIHR) у Беларусі і іншых постсавецкіх краінах доўга працівілася намаганьням Амэрыкі і НДА, якія хацелі распрацоўваць такія праграмы. Толькі ў 2002 г. бюро выдала дапаможнік для мясцовага назіраньня за выбарамі, які могуць выкарыстоўваць НДА ў Беларусі і іншых постсавецкіх краінах[13].

[12] Аднак ЭЎ ужо даўно трэба было аказаць, ад афіцыйных структураў і праз каналы грамадзянскай супольнасьці. Каб палітычна дамагчыся правядзеньня такіх выбараў, ЭЗ у цэлым і ўрады краінаў - сяброў ЭЗ павінны адказаць на беларускі выклік распрацоўкай актыўнай стратэгіі і палітыкі, а не чакаць посьпеху амэрыканскіх намаганьняў з вычакальным скепсісам.

[13] Эўрапейскаму Зьвязу трэба вызваліцца ад боязі нэгатыўнай рэакцыі Расеі. Расея фармуе свае палітыку да Беларусі, ня лічыцца з ЭЗ і ігнаруе ўсе спробы ўплываць на яе. Гэта ілюструе і прыняцьцё ў канцы 2005 г. Расеяй і Беларусьсю Дамовы аб супрацоўніцтве паміж Саюзам Беларусі і Расеі і Саюзам Расеі і Беларусі, якая ўтварыла прававую базу для ўзмацненьня інтэграцыі гэтых краінаў. Гл. ODIHR.GAL/44/02/Rev.1, 23 November 2002.

Варта жалю, што Эўрапейская Рада - урады дзяржаваў - сяброў ЭЗ - не дамовіліся пра супольную палітычную лінію ў гэтым пытаньні, супольную палітычную дактрыну супрацы з грамадзянскімі супольнасьцямі ўва Ўсходняй Эўропе ўвогуле і ў Беларусі ўпаасобку, адпаведную прынятым АБСЭ крытэрам плюралістычных дэмакратыяў, праўнай дзяржавы і павагі да індывідуальных правоў чалавека. Прапановы ўсёабдымных праграмаў дзейнасьці ёсьць. Яны выходзяць у ліку іншага з прыватных фундацыяў, напрыклад, з Фундацыі Бэртэльсмана і з зарэгістраванага аб'яднаньня «Правы чалавека ў Беларусі», а таксама зь літоўскага і польскага бакоў[14].

Але такія праграмы ў эўрапейскім кантэксьце абмяркоўваюцца пераважна з тактычнага гледзішча. Ёсьць гатоўнасьць ісьці на рызыкоўныя рабіць, каб нешта даць перасьледаванай апазыцыі ў Беларусі, каб не выглядаць з зусім пустымі рукамі на тле больш дзейсных амэрыканскіх праграмаў. Апроч таго, гэта спатыкае ўсходнія і схільнасьць Брусэлю паддавацца ціску перадусім палякаў і літоўцаў. Асобнымі захадамі ў рамках гэтых дзеяньняў стала высыланьне сыгналаў, якое, аднак, збольшага засталося бясплённым, бо гэтыя захады ёсьць ня часткамі ўсёабдымнай праграмы, а толькі асобнымі часткамі пазла, складзеным разам менш ці больш адвольна, бо яны ўзьнікаюць у выніку адкрытых прапановаў падтрымкі праектаў.

Радыё- і тэлепраграммы з замежжа, якія сягаюць ня ўсіх часткаў краіны, перадусім не прымаюцца ў Менску, хоць і ёсьць добрым пачынам, але ў цэлым, тым ня менш, неэфэктыўныя. Пры дапамозе такой палітыкі немагчыма ўсталяваць даверлівыя дачыненьні паміж прабеларускім лобі Эўразьвязу і дзяржаваў - сяброў ЭЗ і беларускімі палітычнымі і грамадзкімі апазыцыйнымі сіламі. Аднак гэта - асноўная перадумова супольнай палітычнай стратэгіі.

Надышоў час стварыць такую эўрапейска-беларускую рабочую групу, задачай якой будзе выпрацоўка супольнай праграмы. На жаль, палітычныя партыі і нацыянальныя парлямэнты Эўропы не патрабуюць ад урадаў ініцыятыўнай палітыкі і вызначэньня структурам грамадзянскай супольнасьці сродкаў, патрэбных для таго, каб эфэктыўна падтрымліваць дэмакратыю ў

[14] Ёсьць і іншыя прапановы, напрыклад, Towards a Coherent EU-Strategy for Belarus. Выданьне Фундацыі Бэртэльсмана; Выданьне зарэгістраванага аб'яднаньня «Правы чалавека ў Беларусі». Прапановы Deutschland, die Europäische Union und die Zivilgesellschaft in Belarus, 19.4.2006, Hans-Georg Wieck: In Weißrussland ist Europa auf dem

Беларусі. Эўрапейскі Зьвяз мусіць падхапіць ідэі такой палітыкі, якія зыходзяць з Польшчы і Літвы, і ўключыць іх у эўрапейскую дактрыну «Свабодныя і справядлівыя выбары ў Беларусі». Эўропа ў Беларусі падмачыла сваю рэпутацыю і стрыманае абяцаньне актыўна выступаць за дэмакратычныя рэформы ўва ўсіх частках Эўропы, якое было супольна дадзенае ў парыскай хартыі ў 1990 г. і ў дэкляцыі стамбульскага саміту ў 1999 г. Гэтую рэпутацыю трэба аднавіць.

Holzweg // Internationale Politik 2003. № 12. S. 65–68

ПАЛІТЫЧНАЯ ПРАГРАМА ПА БЕЛАРУСІ ДЛЯ НЯМЕЧЧЫНЫ І ЭЎРОПЫ

Для эфэктыўнай падтрымкі дэмакратыі ў Беларусі патрэбныя дасьведчаныя каардынатары на эўрапейскім і таксама на нацыянальным узроўні. Першым крокам такога каардынатара ў Нямеччыне магло б быць стварэньне каардынацыйнага органу, напрыклад, круглага стала нямецкіх палітычных фундацыяў і іншых арганізацыяў, якія маюць удзельнічаць у падтрымцы дэмакратыі. Дарма што палітычныя фундацыі маюць значны досьвед у сфэры палітычнага дыялёгу ў пераходных краінах, яны пакуль не распрацавалі амаль ніякіх дзейсных інструмэнтаў скаардынаванай і доўгатэрміновай падтрымкі дэмакратычных структураў і грамадзянскіх супольнасьцяў у такіх аўтарытарных краінах, як Беларусь. Гэтыя недахопы трэба выправіць.

Зыходзіць можна з досьведу, атрыманага ў рамках шырокамаштабнай гуманітарнай дапамогі Беларусі пасьля чарнобыльскай катастрофы 1986 г. Зыходным пунктам нямецкай праграмы па Беларусі магла б стаць падтрыманая фэдэральным урадам дзейнасьць нямецкіх і беларускіх НДА, якія працай у сфэрах адукацыі, аховы здароўя, мясцовага самакіраваньня і рынкавай эканомікі маглі б спрыяць разьвіцьцю грамадзянскай адказнасьці і паляпшэньню якасьці жыцьця. Гэтую супрацу для разьвіцьця праз грамадзянскую супольнасьць можна толькі вітаць, але яна не заменіць таго, што павінна адбывацца ў супрацы з апазыцыяй у Беларусі на палітычным узроўні, канкрэтныя прыклады якой падаюцца

ніжэй. Толькі такім шляхам у самой краіне могуць быць створаныя палітычныя перадумовы свабодных і справядлівых выбараў. Са зразумелых прычынаў у першую чаргу ў гэтым палітычным абсягу дзеюць амэрыканскія НДА. У сваёй працы яны абапіраюцца таксама на валянтэраў з краінаў Усходняй і Сярэдняй Эўропы, у тым ліку з Украіны, Славаччыны і Польшчы.

На думку беларускай апазыцыі, падтрымка, якую надаюць ЗША, уласна кажучы, ёсьць тым, чаго чакалі ў першую чаргу ад Эўрапейскага Зьвязу і яго дзяржаваў-сяброў. Але дапамогі з гэтага боку - калі не лічыць адзінкавых захадаў асобных дзяржаваў - сяброў ЭЗ і кагерэнтнай праграмы Кансультацыйна-назіральнай місіі АБСЭ ў 1998-2001 гг. - не было.

Як можа выглядаць эўрапейская праграма падтрымкі дэмакратыі ў Беларусі?

Дакумэнт з палітычнымі рэкамэндацыямі Эўрапейскай рады ў справе падтрымкі дэмакратыі ў Беларусі павінен утрымліваць наступнае.

Трэба прызначыць упаўнаважанага ЭЗ па Беларусі, у абавязкі якога ўваходзіла б:

- кіраваньне фондам для падтрымкі дэмакратыі;

- стварэньне эўрапейскай кансультацыйнай групы па Беларусі;

- стварэньне групы прадстаўнікоў беларускай палітычнай і грамадзкай апазыцыі і яе кансультаваньне эўрапейскай групай;

- каардынацыя і ўхваленьне праектаў у справе Беларусі;

- назіраньне за палітычнымі і грамадзкімі падзеямі ў Беларусі і іх ацэнка ў супрацы з Палітычным камітэтам ЭЗ;

- супраца зь міжнароднымі і нацыянальнымі няўрадавымі арганізацыямі (напрыклад, *Amnesty International, International Helsinki Federation for Human Rights*; палітычнымі фундацыямі ў Нямеччыне і ў іншых краінах);

- супраца з Радай Эўропы і АБСЭ, а таксама зь іншымі зацікаўленымі ў трансфармацыі Беларусі краінамі, а таксама

- ініцыяваньне дасьледаваньняў дэмакратычнай трансфармацыі ў Беларусі і

- дапамога беларускім мас-мэдыям.

Гэты пералік разнастайных задачаў каардынатара наглядна адлюстроўвае складанасьць праблемы.

За якія канкрэтныя задачы трэба ўзяцца?

1. Трансьляцыя тэле- і радыёпраграмаў на расейскай і беларускай мове на даступных грамадзянам частотах, зона прыёму якіх ахоплівала б усю краіну; трансьляцыя найважнейшых праграмаў праз Інтэрнэт[15].
2. Падтрымка рэгіянальных і мясцовых газэтаў у Беларусі.

3. Стварэньне кансультацыйных органаў апазыцыі для сталых кансультацыяў з будучым эўрапейскім упаўнаважаным па Беларусі і ягонай кансультацыйнай групай. Для гэтага варта запрасіць важных прадстаўнікоў палітычных партыяў і супрацоўнікаў грамадзкіх арганізацыяў, а таксама палітыкаў, якія жывуць у эміграцыі.

4. Падтрымка распрацоўкі стратэгічных дакумэнтаў для будучыні Беларусі і для ўрадавых праграмаў.

5. Агульнаэўрапейскія інфармацыйныя кампаніі, прысьвечаныя Беларусі.

6. Выданьне інфармацыйных матэрыялаў пра падзеі ў Эўропе для Беларусі.

7. Падрыхтоўка грамадзянаў да ўдзелу ў выбарчай барацьбе / назіраньні за выбарамі.

8. Падтрымка пабудовы ўнутранай сеткі назіральнікаў на выбарамі і апытальнікаў для правядзеньня *экзыт-полаў* (назіральнікі, юрысты, прэсавыя сакратары).

[15] У сістай сфэры ўжо тое-сёе робіцца, «Немецкая хваля», напрыклад, перадае штодзённую кароткую праграму. Эўрапейская камісія даручыла бэрлінскай PR-агенцыі *Media Consulta* арганізацыю тэле- і радыёпраграмы. З Польшчы таксама перадаецца

9. Правядзеньне міжнародных сустрэчаў спонсараў праграма пра Беларусь, якая, аднак, у першую чаргу разьлічаная на беларусаў, што жывуць у Польшчы.

10. Стварэньне магчымасьцяў адукацыі ў Эўропе для беларусаў.

11. Дапамога асобам, якіх перасьледуюць з палітычных прычынаў.

Калі ў будучыні беларускі аўтарытарны рэжым адкрыецца для сапраўднай дэмакратычнай трансфармацыі, супрацу ўпаўнаважанага па Беларусі і ягоных кансультантаў можна пашырыць на прадстаўнікоў рэжыму і дзяржаўных структураў. У сёньняшніх варунках, аднак, большая частка названых тут дзеяньняў упаўнаважанага ЭЗ па Беларусі і ягоных кансультантаў пакуль мусіць адбывацца па-за межамі краіны, асабліва супраца з палітычнай і грамадзкай апазыцыяй. Тым ня менш, на гэты момант ахопліваецца толькі малая частка насельніцтва Беларусі.

Угрунтаваная на поўным даверы супраца павінна дазволіць беларускай апазыцыі ў любы момант узяць на сябе палітычную адказнасьць за беларускі народ. Няма сэнсу спэкуляваць размовамі аб тым, калі ў Беларусі адбудзецца доўгачаканая зьмена курсу. Важна, каб насельніцтву пастаянна паведамлялася поўная карціна сытуацыі і каб палітычная і грамадзкая апазыцыя была ў стане здабыць давер у краіне і аказалася дзеяздольнай у вырашальны момант.

У сваю чаргу ад Эўрапейскага Зьвязу патрабуецца гатоўнасьць у любы момант неадкладна аказаць першую фінансавую дапамогу і дзейсную палітычную падтрымку. Тое ж датычыць Рады Эўропы і АБСЭ, а таксама нацыянальных урадаў і няўрадавых арганізацыяў.

Пераклаў зь нямецкай Алесь Пяткевіч паводле:
OSTEUROPA, 56. Jg. 2006. № 9. S. 57—72

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 1-2 (53) - 2007
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2007/03/22
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1-2 (53) - 2007**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]–[image]2007

[image] • **крытыка** • эсэістыка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ

Віталь Сіліцкі палітоляг, сталы аўтар «ARCHE». Аўтарская назва тэксту — «Краўчанка на раздарожжы».

Кравченко, Пётр. *Беларусь на распутье, или Правда о Беловежском соглашении: Записки дипломата и политика*. — Москва: Время, 2006. — 456 с.

Палітыкаў у Беларусі засталося няшмат, таму палітычныя мемуары, калі яны з'яўляюцца, — заўсёды добрая навіна для чытача, што цікавіцца найноўшай гісторыяй краіны. Кніга былога міністра замежных спраў Беларусі Пятра Краўчанкі яшчэ і надзвычай цікавая, поўная інфармацыі і высноваў, а акрамя таго — вельмі лёгка чытаецца. Усё ж стыль і далягляд заўзятага бібліяфіла і, хай на мяне не скардзяцца, міліцэйскага генерала адрозніваюцца на некалькі парадкаў. Аднак да апошняй старонкі мяне не пакідала ўражанне, што, акрамя ўголас выказаных думак, у мемуарах спадара Краўчанкі ёсць нейкі схаваны падтэкст. Як быццам усё напісана моцна і талкова, але навязваецца штосьці такое, з чым прынцыпова згадзіцца і прыняць чаго не магу. Зрэшты, такое адчуванне цалкам нармальнае, калі прыняць пад увагу, што пісаў жа

мемуары дыпламат.

Краўчанкава кніга — толькі прыкладна на пятую частку тое, пра што заяўлена ў падзагалоўку, — «праўда пра Белавежскае пагадненне». Здаецца, падзагаловак кнігі — гэта толькі маркетынгавы ход, які, магчыма, накіраваны на тое, каб прыцягнуць да яе ўвагу расейскага чытача (кніга, вядома ж, друкавалася ў Маскве). Спадар Краўчанка цудоўна разумее гістарычнасць падзеі, якую не ў стане затушаваць разнастайныя выкрыцці пракамуністычных і праімперскіх аратараў. Ён, вядома, аддаў даніну пэўнаму камізму падзей канца 1991 г. у Віскулях: то звычайнай друкаркі не было, каб выдрукаваць лёсавызначальны дакумент, то Шушкевіч, падхапіўшы Ельцына, што падаў з прыступак, зрабіў свой, можа, самы значны ўнёсак у гісторыю (за што з барскага пляча, ці, хутчэй, кішэні, быў узнагароджаны гадзіннікам, які потым усім паказваў). Параўноўваючы са сведчаннямі іншых удзельнікаў падзеяў, напрыклад, былога расейскага прэм'ера Ягора Гайдара, разнабояў у мемуарах няма, так што, хутчэй за ўсё, менавіта так яно і было. Цікавая дэталь толькі тое, як тагачасны старшыня КДБ Беларусі Эдуард Шыркоўскі падчас апавяшчэння канчатковага дыягназу СССР увесь час сігналізаваў у Маскву Гарбачову, прапануючы «накрыць усю гэтую каманду», і як хуценька-асцярожненька разбягаліся з Белавежскай пушчы два прэзідэнты і адзін спікер, каб, крый Божа, насамрэч нічога не здарылася.

Нашмат болей, чым пра Белавежскія пагадненні, у мемуарах кажацца пра тое, пра што і ў асноўным загалоўку, — пра Беларусь і яе раздарожжа. Краўчанка відавочна не проста пераказвае гісторыю, але і імкнецца паказаць у ёй ролю асобы. Дзякаваць Богу, не толькі спадара Лукашэнкі — кажу шчыра, бо хацелася ўжо прачытаць і пра штосьці іншае. Каларытнасць намаляваных у кнізе вобразаў лідараў і правадыроў буйнога і дробнага памеру, вядома, саступае, напрыклад, вобразам тых самых персанажаў, алегарычна раскрытых у кнізе Яўгена Будзінаса «Дураки». Але ўсё роўна цікава і павучальна. Спадар Краўчанка таксама (а можа, і перш за ўсё) імкнецца паказаць ролю сваёй асобы, на што як першы міністр замежных спраў незалежнай Беларусі і адзін з асноўных палітычных гульцоў

далукашэнкаўскай эпохі ён, канечне, мае поўнае права. Іншая справа, што кантраст паміж дзяржаўным мужам еўрапейскага памеру і зграяй дробязных правінцыйных небаракаў выглядае занадта нацягнутым, нават сумнеўным. Тое, што паводле здольнасцяў і інтэлекту Краўчанка вылучаўся на фоне беларускай эліты, альбо ўсіх трох элітаў, у якіх ён паспеў засвяціцца, — наменклатурнай, апазіцыйнай і лукашэнкаўскай — гэта безумоўна. Але ці не быў ён сам пэўнай часткай той формулы, якая ўрэшце мела вынікам Лукашэнку? Сам аўтар, відавочна, імкнецца даць адмоўны адказ, але вось акурат тут могуць з'явіцца вялікія сумненні.

Як і можна было чакаць, вялікая частка кнігі адводзіцца пад успаміны спадара Краўчанкі пра сваю дыпламатычную дзейнасць на пасадзе міністра замежных спраў і пра поспехі беларускай дыпламатыі, якія былі пры ім дасягнутыя. Канечне, аўтар мае на гэта поўнае права, тым больш што аніводзін ягоны наступнік не надаваў (з вядомых прычынаў) столькі ўвагі і высілкаў прамоцыі беларускай культуры ў свеце. Таксама не выклікае сумневаў (і таксама зразумела — чаму), што і пошукі крыжа Святой Еўфрасінні, і «раскрутка» імя Скарыны, і спробы ангажаваць у беларускія справы сусветную палітычную і эканамічную эліту — усе гэтыя рэчы былі асабістай ініцыятывай Краўчанкі — таксама як і трохі авантурная задумка з вылучэннем Беларусі прэтэндэнтам на сяброўства ў Радзе Бяспекі ААН. Я тут не пра мэтазгоднасць такога вылучэння, а пра тое, як яго імкнуліся дасягнуць. Распавядаючы пра абыякавасць кіраўніцтва Беларусі, спадар Краўчанка неяк забыўся ўзгадаць пра абсалютна бязглуздую і небяспечную спробу шантажаваць Латвію тэрытарыяльнымі прэтэнзіямі ў выпадку адмовы ад падтрымкі Беларусі ў ААН. Пры гэтым Краўчанка з горыччу распавядае, як яго цкавалі і адкрыта падстаўлялі і беларускае кіраўніцтва, і былы амбасадар ЗША ў Беларусі Джордж Сворц. Аднак чаго іншага было спадзявацца пры такой гульні, якую страту маглі ўчыніць краіне такія захады і якога яшчэ стаўлення да сабе можна было чакаць?

Разважаючы пра палітычную кар'еру спадара Краўчанкі, мне цяжка быць аб'ектыўным, не валодаючы ўсёй інфармацыяй пра

ягоную дзейнасць. Аднак з таго, што можна ўзгадаць па памяці, ён сапраўды вылучаўся на тагачасным палітычным фоне спачатку БССР, а потым і маладой незалежнай Беларусі. Яго аднаго з нямногіх прадстаўнікоў старой наменклатуры (хоць ён і быў надзвычай маладым яе прадстаўніком) можна аднесці да катэгорыі нацыянал-камуністаў — той часткі камуністычнай эліты, якая пабачыла ў развале імперыі не пагрозу, а перспектыву для, калі можна так сказаць, «перафарматавання» і самалегітымізацыі. Пры гэтым наменклатуры ён служыў верна, чаго, аддамо даніну, і сам не адмаўляе (хоць і імкнецца пераканаць чытача, што пры гэтым ён паслядоўна сціскаў «фігу ў кішэні»). Думка пра тое, што менавіта адсутнасць такой праслойкі нацыянал-камуністаў не дазволіла Беларусі пайсці не лукашэнкаўскім, а, скажам, украінскім шляхам і ўрэшце прывяла да дыктатуры, з перспектывы часу сёння падзяляецца многімі многімі. Краўчанка сваімі назіраннямі за старой наменклатурай слюнькоўска-сакалоўскага разліву дапамагае зразумець, чаму такой праслойкі ў Беларусі не было і, мабыць, не магло быць. Дастаткова эпізоду, калі Слюнькоў, учыніўшы разнос Генадзю Барташэвічу, колішняму сакратару ЦК, за тое, што той выступіў публічна па-беларуску, загадаў яму «больше не распинаться перед свиньями». Але відавочна, што ў той самы час аўтар усімі сіламі імкнецца паказаць, што, за выключэннем Генадзя Барташэвіча, на такую ролю ў Беларусі мог прэтэндаваць толькі ён. Што наводзіць на гэтую думку? Перш за ўсё, стараннае і паслядоўнае пераконванне чытача ва ўласным дэмакратызме і латэнтнай апазіцыйнасці сістэме, пачынаючы з сумнавядомых падзеяў 1986 г., першай дэманстрацыйнай правакацыі партыйных уладаў супраць нацыянальных актывістаў за гарбачоўскімі часамі. Прыводзяцца шматлікія доказы недатычнасці Краўчанкі — сакратара менскага гаркама па ідэалогіі — да самых адыёзных і пачварных акцыяў сакалоўскага кіраўніцтва тых часоў. Можа, тагачасным апанентам аўтара ёсць што дадаць ці запярэчыць, але гэта не важна. Той самы Краўчук, да таго як перафарбаваўся ў нацыяналіста, быў далёка не анёлам адносна нацыянальнай культуры і інтэлігенцыі. Не верыць у шчырасць беларускасці Краўчанкі ў мяне таксама няма аніякіх падставаў — гэта азначала б не паверыць і тысячам тых (уключаючы многія дзесяткі асабістых сяброў і калегаў), якія ўсвядомілі

сябе беларусамі менавіта ў той час.

Канечне, Краўчанку не хапала ў свой час статусу і вагі, каб стаць беларускім Краўчуком і Бразаўскасам. Перспектывы нейкія былі. Як магчымага палітычнага канкурэнта яго рана запрыкмеціла апазіцыя БНФ і, нягледзячы на яго прыхільнасць да беларушчыны, актыўна не любіла і відавочна асцерагалася (гатоў паспрачацца з кім заўгодна, што, выбіраючы паміж Дземянцеем і Краўчанкам, той самы Зянон Пазьняк тады хутчэй згадзіўся б на спадара Дземянцея). Аднак ягоныя паводзіны і ўласная нарацыя выкрываюць у ім перш за ўсё прадстаўніка, хай сабе і бадай самага яскравага, той бязглуздай наменклатуры, якой перадаліся пэўныя рысы і стыль паводзінаў, у тым ліку і асцярожнасць, нежаданне заўчасна лезці на ражон, пэўны страх перад уласнай палітычнай гульнёй. Краўчанка прадстаўляе такія свае паводзіны перш за ўсё як праяву прыстойнасці і лаяльнасці камандзе, за якую ён гуляў. Гэта, безумоўна, не самая дрэнная чалавечая рыса. Але разам з гэтай камандай ён даў сабе зацягнуцца ў балота, у якім усе разам патанулі, а выпаўзалі ўжо паасобку (за выключэннем тых, хто заўчасна «навастрыў лыжы» да пераможцаў — дадамо дзеля праўды, што самога Краўчанкі ў тым сегменце «Тытаніка» кебічаўскай наменклатуры першапачаткова не аказалася). Свой палітычны стыль Краўчанка сам раскрыў, распавёўшы пра эпізод з прапановай Кебіча прызначыць яго намеснікам прэм'ера па сацыяльных пытаннях у 1990 г., якую ён адхіліў. Апрача тлумачэнняў аўтара, што займацца тым, чым ён займаўся ў гаркаме, яму было больш нецікава, відавочна і іншае: такі шалёны кар'ерны ўзлёт для яго азначаў бы прыняцце адказнасці за стопрацэнтна правальны ў той час кірунак, а следам за ім — поўны крах палітычных перспектываў. Не рызыкаваў Краўчанка і надалей. А рызыка — гэта ўсё ж такі неабходная якасць любога амбіцыйнага палітыка, які імкнецца да большага.

Выказваю гэтыя меркаванні толькі таму, што сам спадар Краўчанка занадта ж часта нагадваў пра тое, як і колькі разоў ён разглядаўся рознымі групоўкамі як прэтэндэнт на беларускі палітычны Алімп. І ў 1990 г., калі яго трымала ў запасе

наменклатура сярэдняга звяна на пасаду старшыні Вярхоўнага Савета, і ў 1994 г., калі прамыслоўцы раптам абвясцілі яго магчымым кандыдатам у прэзідэнты, і ў 1996 г., калі заходнія дыпламаты называлі яго адзіным годным канкурэнтам Лукашэнкі (увесь час, праўда, Краўчанка падае гэтыя меркаванні і вылучэнні як падставы, за якія ён нацярпеўся, перш за ўсё ад Кебіча). Палітычныя амбіцыі — рэч не ганебная, і саромецца іх не трэба. Ды і заднім чыслом, калі б замест Лукашэнкі прэзідэнтам зрабіўся б Краўчанка, асабіста я быў бы толькі шчаслівы. Праблема, безумоўна, не ў тым, хто стаў, а хто не стаў прэзідэнтам, а ў тым, хто здолеў ці не здолеў браць на сябе ў крытычныя моманты палітычную адказнасць і ініцыятыву. А тут, што ў 1994-м, што ў 1996-м, у аўтара — пераважна апраўданні і памкненне спіхнуць адказнасць за правалы як кебічаўскага ўрада, так і Вярхоўнага Савета 13 склікання на кагосьці іншага ці на аб'ектыўныя абставіны.

Азіраючыся на драматычныя падзеі найноўшай гісторыі Беларусі, Краўчанка імкнецца іх пераасэнсаваць, прад'явіць сваё бачанне. Трэба сказаць, ягоныя высновы не занадта арыгінальныя. Тое, што наменклатура люта ненавідзела беларускасць, мы ведаем і нават добра памятаем, як ненавідзела. Тое, што Беларусь дакацілася да лукашызму праз адсутнасць пачуцця гістарычнай адказнасці і здольнасці да стратэгічнага кампрамісу паміж рознымі часткамі беларускай эліты тых часоў, — таксама. Не сакрэт і тое, што Станіслаў Шушкевіч быў, мякка кажучы, слабым палітыкам, няздольным стаць лідарам нацыі. Тое, што Вячаслаў Кебіч, як кажуць, зажраўся і прафукаў уладу, мы таксама памятаем. Таксама як памятаем пра авантурызм «маладых ваўкоў». Як і пра поўную бесхрыбетнасць кіраўніцтва Вярхоўнага Савета 13 склікання, якое бязвольна капітулявала перад Лукашэнкам. Ну а пра шлях «віртуальнага змагання», абраны апазіцыйным Тое, што наменклатура люта ненавідзела беларускасць, мы ведаем і нават добра памятаем, як ненавідзела.кіраўніцтвам пасля 1996 г., за які яго літаральна разносіць Краўчанка, пісалася і казалася шмат і доўга. Як відавочца падзеяў Краўчанка дадае да гэтых збольшага стандартных высноваў шмат новых адценняў, якія вядомыя толькі непасрэднаму ўдзельніку падзеяў. Дадае ў такой форме, што адразу адчуваецца імкненне

звесці рахункі. Асабліва з Шушкевічам, якога Краўчанка відавочна, мякка кажучы, не любіць. Болей за тое, Краўчанка лічыць сябе хіба не палітычным бацькам Шушкевіча, распавядаючы пра тое, як ледзьве не сам, будучы страшынёй гаркама партыі, прасоўваў яго па службовай лесвіцы (спадар Шушкевіч, дарэчы, першы раз у жыцці стаў прарэктарам, калі спадар Краўчанка быў хіба ў войску). Не ведаю, але калісьці на свае вочы назіраў, як пра свае правы «палітычнага бацькі» Шушкевічу проста ў вочы заяўляў Зянон Пазьняк. Калі так не любіце дзіця, то навошта так упарта змагацца за бацькоўства.

Калі чытаеш пра паводзіны і выбрыкі першага фармальнага кіраўніка незалежнай Беларусі, пра яго прыстасавальніцтва, панічнае нежаданне прымаць цяжкія рашэнні ці ўвогуле рабіць выбар, пра дробязныя і не вельмі дробязныя падставы, не ведаеш, ці смяяцца ці плакаць. (Што-што, а тое, як падчас візіту ў Польшчу ў 1992 г. Шушкевіч перайшоў з беларускай мовы на расейскую, калі польскі дыпламат папрасіў яго размаўляць *на общепонятном языке*, сапраўды шакавала, улічваючы, што гэта быў Шушкевіч, а не лукашэнкаўскі вертыкальшчык). Праўда гэта ці не — хай вырашаюць спадары Шушкевіч і Краўчанка, аднак, мяркуючы па тым, што замалёўкі з натуры не супярэчаць паводле духу з уласнымі назіраннямі за гэтым палітыкам, то прынамсі выглядае падобным на праўду.

Яшчэ адзін палітык, якому Краўчанка адкрыта помсціць, малюючы з яго прыдворнага блазна, гэта іншы спікер беларускага парламента, ужо 13 склікання, Сямён Шарэцкі. Тут, як кажуць, ёсць за што, бо ганебная і баязлівая здача канстытуцыі і парламента ў лістападзе 1996 г. большасці з нас не забудзецца ніколі. Трошкі большым адкрыццём было апісанне амаль такой самай панічнай бязвольнасці Кебіча, які, са словаў Краўчанкі, мусіў з'язджаць з Мінска, каб за яго нейкую непапулярную пастанову падпісаў Мясніковіч. У цэлым, да Кебіча як да былога патрона Краўчанка ставіцца вельмі лаяльна і абыходзіць самыя вострыя моманты (толькі хіба ў адным месцы ўзгадваючы пра папойкі падчас перадвыбарчай кампаніі). Таксама дзіўна (або не дзіўна), што так шмат распавядаючы пра тое, як беларускія палітыкі ездзяць у Маскву за ярлыком, пра халуйскія паводзіны ўжо згаданых

Шушкевіча і Шарэцкага, аўтар забываецца пра тыя саладжавыя пацалункі з Чарнамырдзіным і памкненне здаць Беларусь у абмен на ўладу, якое дэманстраваў сам Кебіч падчас прэзідэнцкай кампаніі. Болей за тое, разважаючы пра паразу Кебіча, недальнабачнасць свайго былога патрона і здраду ўнутранага кола былога прэм'ера, Краўчанка прадстаўляе сябе выключна як ахвяру, чалавека, якога не зразумелі і недаацанілі, які мусіў ціха займацца сваёй справай у перадвыбарчым штабе — ўлёткамі, плакатамі. Аднак можна дадаць і ўзгадаць, як кебічаўскія прапагандысцкія матар'ялы толькі падлівалі смалы ў агонь нянавісці да Кебіча...

Успаміны пра Вярхоўны Савет 13 склікання і пра трагедыю лістапада 1996 г. цяжка чытаць спакойна — ці то ў гэтай кніжцы, ці то дзе яшчэ. Тут ізноў шмат новага мы не даведаліся. Вінаватыя, як кажуць, вядомыя, наступствы відавочныя. Аддамо даніну спадару Краўчанку за тое, што ён ніколі не адклікаў свайго подпісу пад зваротам пра імпічмент Лукашэнкі ў Канстытуцыйны суд. Шкада толькі, што аўтару гэтых радкоў персанальна давялося перагаварыць не з адным дзесяткам удзельнікаў тых падзеяў, і кожны раз даводзілася чуць адно і тое самае — маўляў, нехта здрадзіў, нехта прагнуўся, нехта збаяўся, нехта не здолеў, нехта, нехта, нехта... У перамогі шмат бацькоў, параза — сірата. Калектыўнае дзеянне, супраціў, барацьба — гэта не толькі гуртаванне ў кагал, гэта перш за ўсё сума індывідуальных высілкаў, цвёрдасці, гатоўнасці ісці да канца. Што з таго, што Шарэцкі аказаўся «трапкай», калі Краўчанка ці хто іншы (дайце любое прозвішча дэпутата ВС 13-га склікання, за выключэннем двух ці трох) пачынаюць заяўляць аб правале імпічменту толькі праз некалькі год, карыстаючыся гэтым як пэўнай індульгенцыяй? Калектыўная безадказнасць — рэч такая ж зручная для нашых палітыкаў, як калектыўны сэкс — для савецкага турыста, які дацяміў, што заўжды можна саскочыць. Палітык А моўчкі выйшаў з будынка Вярхоўнага Савета, таму што тое самае зрабілі палітыкі B, C, D, і E. Колькі разоў мы ўжо чулі такія тлумачэнні, аднак гэта не мяняе сутнасці. Моўчкі выйшлі ўсе разам і кожны паасобку.

Выключэнні, вядома, былі, і перш за ўсё — Віктар Ганчар. Пра

Ганчара Краўчанка ў канцы кнігі кажа многа як пра адзінага, хто адмовіўся гуляць у віртуальную апазіцыю, да якой урэшце скаціліся аскепкі парламента 13 склікання. Другім дэпутатам, які адмовіўся гуляць у гэтую гульню, быў, вядома, сам Краўчанка. Тут ён зноў пераказвае ўсё, што ўжо даўно было сказана, — і пра грантасмокаў, і пра ваяжы на Захад, і пра тое, што частку апазіцыі спадар Лукашэнка цалкам задавальняў, бо дазваляў захаваць «элементы салодкага жыцця» без аніякай палітычнай ці грамадскай адказнасці ў нагрузку, і пра тое, што Вярхоўны Савет літаральна здаў Ганчара, калі той знік (з гэтым не пагадзіцца нельга; дадамо, што здаў яго таксама і Захад: паводле маіх успамінаў, нават у сакавіку 2000 г., праз паўгода пасля гэтага знікнення, кіраўнік групы АБСЕ ў Менску Ханс-Георг Вік катэгарычна адмаўляўся нават размаўляць пра тое, што Ганчара выкралі і яго ўжо няма ў жывых. Бязглуздая, відавочна правальная задумка з перамовамі прывяла да таго, што тэма знікненняў заставалася дэ-факта па-за ўвагай). Так яно ці не так, але дзідаў з гэтай нагоды было зламана шмат. Аднак, як кажуць, той, хто хоча, шукае магчымасці, той, хто не хоча, шукае нагоды. Таму злоўжываць імем і лёсам Ганчара, каб апраўдаць уласны зыход з апазіцыі, не вельмі пасуе заслужанаму чалавеку. Урэшце, спадары Ганчар і Краўчанка пайшлі рознымі шляхамі, зрабілі розныя выбары. Першы назаўжды застанецца ў гісторыі Беларусі як лідэр, які не баяўся. Другі — як цудоўны міністр замежных спраў, разумны дэпутат, аўтар цікавых мемуараў — і амбасадар у Японіі, якому давялося выцерпець на сабе здзек і прыніжэнне (не толькі сябе — дзяржавы) падчас таго самага візіта прэзідэнта НАК Беларусі ў Нагана ў лютым 1998 г. Пятро Краўчанка меў поўнае права лічыць, што пераход да супрацоўніцтва з лукашэнкаўскім рэжымам на пасадзе, якая не вяла да ўдзелу ў аніякіх рэпрэсіях, быў лепшым варыянтам, чым знікненне ў апазіцыйным балоце. Ідучы на гэты крок, ён, аднак, мусіў разумець, што купляе квіток у адзін канец. Ён можа знайсці разуменне, нават спачуванне чытача, але наўрад ці можа разлічваць на тое, што ягоны аўтарытэт як публічнага палітыка калі-небудзь адродзіцца, асабліва пасля дзіўных абставінаў сканчэння ягонага амбасадарства ў Японіі, пра што ў мемуарах, са зразумелых прычынаў, не сказана ані слова. Урэшце, палітычнае лідарства і маральны аўтарытэт не церпяць зігзагаў

і пошукаў апраўданняў — асабліва сёння, калі колькасць тых, хто не прыняў правілаў гульні і пайшоў на абардаж, прайшоў праз хіміі і Акрэсціна, праз плошчу Каліноўскага, адседзеў доўгія турэмныя тэрміны, вымяраецца ўжо не дзесяткамі.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2007/03/22**
[image]